Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

1 ЧЭРВЕНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР №102 (28466)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Знайсці сябра ў любым узросце**

СТАР. 4



**Нясумныя канікулы**

СТАР. 8



**Паўтарыў лёс многіх «звяздоўцаў»**

СТАР. 11

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Васіль ЖАРКО, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Трэба думаць пра здароўе нашага будучага пакалення. Як педыятр кажу: вучань малодшых класаў павінен спаць мінімум 10 гадзін, сярэдніх — 9, старшых — 8 гадзін. У колькі нашы дзеці кладуцца? У колькі нашы ўнукі кладуцца? У колькі мы можам іх пакласці? Калі дзіця прыходзіць не выспаўшыся, а яшчэ заняткі паставілі адразу складаныя, ідзе хваляванне, стрэс, веды не засвойваюцца. Пік найлепшага засваення школьнай праграмы прыпадае на 10.30—14.00».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 1.06.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8673 | ▲ |
| Еўра | 2,0881 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0329 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0709 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# БУДУЧЫНЯ ЕЎРОПЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Двухгадовыя палачанкі Дар'я ШАКАВА і Ева САРАЧЫНСКАЯ каля знака «Цэнтр Еўропы», які ўстаноўлены ў самым старажытным горадзе Беларусі.

■ Жамчужыны Беларусі

# ПАЛАЦ ШУКАЕ СПОНСАРА



**Рэканструкцыя аднаго з найпрыгажэйшых гісторыка-культурных помнікаў Беларусі можа расцягнуцца на дзесяцігоддзі**

**Знаўцы параўноўваюць Жыліцкі палацава-паркавы комплекс з Гомельскім, а некаторыя наогул ставяць яго ў шэраг з Мірскім і Нясвіжскім замкамі. Дарэчы, пры апошніх гаспадарах з роду Булгакаў ён па сваёй замкнёнай форме сапраўды нагадваў замак. Будынку пашчасціла. Ён ніколі не пуставаў. Пасля рэвалюцыі тут была школа для працоўнай моладзі, потым доўгі час размяшчаліся сельскагаспадарчыя ўстановы, цяпер аб'ект цалкам належыць культуры. Вялікі палац плошчай каля трох тысяч квадратных метраў з 2009 года знаходзіцца на рэканструкцыі. Планавалася, што ў 2018 годзе тут ужо можна будзе праводзіць балі ў традыцыях XIX стагоддзя. Але, на жаль, тэрміны рэканструкцыі зацягваюцца. Сёння цалкам зроблены толькі першая і напалову другая чэргі аб'екта. А іх усяго чатыры. Грошай на сённяшні дзень не хапае. Каб паскорыць працэс аднаўлення і прыцягнуць увагу спонсараў да ўнікальнага аб'екта, Нацыянальная акадэмія навук нядаўна правяла на яго базе рэспубліканскі семінар «Жылічы на гісторыка-культурнай карце Беларусі».**

СТАР. 5

■ Год навукі

# Пчолы адпачываюць...

## Як з'яўляюцца новыя сарты груш і яблынь

**Калі на цвіценне знаходзішся ў садах Інстытута пладаводства Нацыянальнай акадэміі навук, адчуванне, быццам у казку трапіў. Тут вы сустрэнеце яблыні не толькі ў беласнежнай пене, але і з кветкамі розных адценняў ружовага і нават барвовага колеру. На асобных дрэвах — лісты незвычайнай формы: бываюць нават падобныя на кляновыя і чарэшневыя. Кажуць, і плады да сезона тут будуць на зайздрасць — асобныя грушы і яблыкі хоць у касках збірай — важаць па 600-800 грамаў. У самым росквіце мы заспелі грушы і разам з вучонымі паўдзельнічалі ў апыленні. Наіўныя, мы спадзяваліся, што з тых кветачак, куды карэспандэнты «Звязды» нанясуць пылок, можа атрымацца насенне, якое з цягам часу выстраліць «новым сортам», і на чарговы юбілей газеты можна будзе палюбавацца на цудоўныя плады. Аказалася, што не так проста нешта стварыць. Гэта ўнікальныя выпадкі, калі скрыжоўванне адразу дае новы сорт яблыкаў ці груш. Часцей з соцень і нават тысячы сеянцаў атрымліваюцца асобныя ўдалыя экземпляры.**

СТАР. 9

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

■ Парламенцкі дзённік

# АГУЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ЛЯГЧЭЙ ВЫРАШЫЦЬ РАЗАМ

**47 краін ужо зарэгістраваліся, каб удзельнічаць у сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ ў Мінску, якая пройдзе з 5 па 9 ліпеня. Пра гэта паведаміў старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА на сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным паслом Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі Фіёнай ГІБ.**

Уладзімір Андрэйчанка расказаў, што Беларусь для сесіі ПА АБСЕ рыхтуе рэзалюцыю на тэму «Распрацоўка своечасовых і эфектыўных заканадаўчых, нарматыўных, адміністрацыйных мер рэагавання на з'яўленне новых псіхаактыўных рэчываў». Ён прапанаваў, каб парламентарыі Вялікабрытаніі таксама падключаліся да абмеркавання такой сур'ёзнай праблемы, як барацьба з наркатрафікам. Старшыня Палаты прадстаўнікоў падкрэсліў: «Нягледзячы на тое, што ў нас крыху адрозніваюцца прыярытэты ў знешняй палітыцы, калі казаць пра двухбаковыя адносіны, я не бачу на сёння вялікіх праблемных пытанняў». Да таго ж Уладзімір Андрэйчанка прапанаваў сумесна абмяркоўваць і такія сур'ёзныя міжнародныя пытанні, як тэрарызм, арганізаваная злачыннасць, гандаль людзьмі і нелегальная міграцыя.

У сваю чаргу Фіёна Гіб адзначыла плённую працу з Сяргеем Алейнікам, Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў Злучаным Каралеўстве Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі. Кантакты спрыяюць і развіццю гандлёвых адносін. «На жаль, у мяне, як у пасла, няма магчымасці паскорыць прыход інвестыцый: гэта прыватныя рашэнні бізнесменаў, — тлумачыць спадарыня Гіб. — Але я збіраюся ўсяляк садзейнічаць зацікаўленасці бізнесменаў. Таму што ёсць вялікія магчымасці ў Беларусі. Нашы бізнесмены не вельмі добра разумеюць іх. Мая справа — прыцягнуць іх сюды разам з дапамогай спадара Алейніка».

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

# СІТУАЦЫЯ З ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕМ ПАЛЯПШАЕЦЦА

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі задалі пытанні членам Урада. Агучвалі як праблемы сваіх выбаршчыкаў, так і ўласныя прапановы. Усе пытанні датычыліся сацыяльнай сферы, адны з найбольш важных напрамкаў — ахова здароўя і беспрацоўе.**

## Берагчы галоўнае

**Намеснік прэм'ер-міністра Васіль ЖАРКО,** выступаючы перад парламентарыямі, звярнуў увагу на тое, што на працягу апошніх гадоў узровень бюджэтнага фінансавання аховы здароўя застаецца ў памеры не меншым за 4% ад ВУП. Беларусь займае другое месца сярод краін СНД па працягласці жыцця (74,1 года). Даўжэй жывуць толькі ў Арменіі (74,9 года). Развіццё аховы здароўя ідзе ў тым ліку па шляху ўкаранення лічбавых сродкаў: тэлемедыцынскага кансультавання, электронных рэцэптў і картак. Дарэчы, летась на экспарце медыцынскіх паслуг заробле на $40 млн. Такая дынаміка захоўваецца і сёлета.

Пэўным дасягненнем з'яўляецца тое, што доля беларускіх медыцынскіх сродкаў на айчынным рынку займае больш за 50% у цэнасным выражэнні. Штогод асвойваецца каля сотні новых лекавых прэпаратаў. Зараз галоўная задача — захаваць долю ўнутранага рынку і забяспечыць не менш за 30% паставак прадукцыі на экспарт. Але вядома, што хваробу лепш прадухіліць, чым потым лячыць. У маі пачаў працаваць першы нацыянальны інтэрнэт-партал «Здаровыя людзі», накіраваны на падтрымку здаровага ладу жыцця.

Пра існуючыя праблемы і перспектывы беларускай медыцыны парламентарыі пацікавіліся ў **міністра аховы здароўя Валерыя МАЛАШКІ.** Яны звярнулі ўвагу на распаўсюджанне дыябету сярод моладзі, абмежаваныя магчымасці інвалідаў-калясачнікаў, будаўніцтва лячэбнага корпуса анкадыспансера побач з Полацкам і Наваполацкам, а таксама своечасовую і кваліфікаваную дапамогу людзям, якія жывуць далёка ад буйных гарадоў.

## На працоўным месцы

Сёлета ўжо праведзены два пераразлікі мінімальных і сацыяльных пенсій, плануецца, што яшчэ два чарговыя будуць праведзены 1 жніўня і 1 лістапада. Важным пытаннем, якое хвалюе і парламентарыяў, і грамадзян, застаецца працаўладкаванне. **Міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ** адзначыла, што асноўныя фактары, які зніжаюць колькасць занятых у эканоміцы, — гэта смяротнасць у працаздольным узросце, старэнне насельніцтва і аптымізацыя на прадпрыемствах. Зараз індывідуальныя прадпрымальнікі і малы бізнес не ствараюць неабходную колькасць рабочых месцаў.

За апошнія некалькі месяцаў адзначана станоўчая тэндэнцыя на рынку працы. **Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ** падкрэсліў, што занятасць насельніцтва — важны паказчык здароўя грамадства. Трэба над гэтым працаваць.

## Вучэбнае пытанне

Хутка змены чакаюць і галіну адукацыі. На завяршальнай стадыі знаходзіцца новая рэдакцыя Кодэкса аб адукацыі. Да 1 верасня ў школы паступяць абноўленыя вучэбныя праграмы, якія будуць улічваць міждысцыплінарныя сувязі і мець практычны кірунак. Дарэчы, адзін з напрамкаў развіцця сярэдняй адукацыі — гэта больш глыбокае ўкараненне профільных дысцыплін. Перш за ўсё гэта датычыцца тых установ, дзе існуюць адпаведная матэрыяльна-тэхнічная база і высокакваліфікаваныя кадры. Зараз работа ідзе над паляпшэннем падручнікаў. Да 2020 плануюць выдаць 231 абноўлены вучэбны дапаможнік.

Міністэрства адукацыі сёлета правядзе дэтальны аналіз работы ВНУ. Па яго выніках будуць прыняты меры па спыненні падрыхтоўкі па незапатрабаваных у эканоміцы спецыяльнасцях. Парламентарыі звярнулі ўвагу і на дашкольную адукацыю. Васіль Жарко запэўніў, што пытанні з кроквай даступнасцю і дэфіцытам месцаў у дзіцячых садках будуць вырашаны да 2020 года.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*

■

# ПРАЕКТЫ НА ПЕРСПЕКТЫВУ

**Экспарт беларускай прадукцыі ў Турцыю і Кубу можа павялічыцца. Аб гэтым учора заявіў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАХМАНАЎ на пасяджэнні Савета Рэспублікі. Усяго парламентарыі абмеркавалі 7 законапраектаў.**

— Блок пытанняў прысвечаны гандлёва-эканамічным адносінам Беларусі, і тут мы разглядаем два праекты законаў. Першы датычыцца гандлёва-эканамічных адносін з Турцыяй у адпаведнасці з рашэннем, якое было прынята на вышэйшым узроўні, аб стварэнні «зялёнага калідора», — нагадаў сенатар. — Другі — нашых адносін з Кубай. Мы разлічваем, што прыняцце гэтых законаў у канчатковым выніку дазволіць павялічыць экспарт беларускай прадукцыі і дамагчыся пазітыўнага сальда.

Яшчэ адно важнае пытанне, якое было на парадку дня, — законапраект аб ваенна-тэхнічным супрацоўніцтве з Балівіяй. «У нас ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва развіваецца вельмі актыўна, ёсць добрыя пазітыўныя вынікі, таму з прыняццем гэтага законапраекта мы створым яшчэ лепшую дынаміку ў гэтай сферы», — дадаў Сяргей Рахманаў.

Падчас пасяджэння сенатары таксама разгледзелі законапраект, прысвечаны змяненню закона аб сацыяльным абслугоўванні. «Гэты закон удакладняе панацыйны апарат, тэрміналогію, удакладняюцца паняцці «цяжкая жыццёвая сітуацыя», «сацыяльная паслуга» і «сацыяльны праект», — адзначыла **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірына СТАРАВОЙТАВА.** — Ён дае магчымасць і стварае ўмовы для таго, каб фізічныя асобы ажыццяўлялі дзейнасць у сферы сацыяльных паслуг».

Паводле слоў парламентарыя, у законе ўдакладняецца роля грамадскіх арганізацый у аказанні сацыяльных паслуг. Акрамя таго, уносяцца змены ў арганізацыю конкурсу на аказанне сацыяльнага дзяржаўнага заказу, таксама ўладам даецца магчымасць прымаць рашэнні па ўвядзенні новых відаў і формаў сацыяльнай паслугі ў залежнасці ад патрэб насельніцтва і рэгіянальных умоў.

* * *

На пасяджэнні сесіі Савета Рэспублікі былі ўручаны ўзнагароды Савета Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД. Старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч уручыў медаль «МПА СНД. 25 гадоў» кіраўніку Адміністрацыі Прэзідэнта, члену Савета Рэспублікі пятага склікання Наталлі Качанавай, старшыні Савета Рэспублікі чацвёртага склікання Барысу Батуру і старшыні Савета Рэспублікі чацвёртага і пятага скліканняў Анатолю Рубінаву за заслугі ў справе развіцця і ўмацавання парламентарызму, уклад у развіццё і ўдасканаленне прававых асноў функцыянавання СНД, умацаванне міжнародных сувязяў і міжпарламенцкага супрацоўніцтва.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

■ Ва ўрадзе

# Станоўчая дынаміка захоўваецца

## У Савеце Міністраў ацанілі стан эканомікі краіны за чатыры месяцы

**Пакуль колькасць звольненых перавышае колькасць прынятых на работу. Пра гэту асаблівасць сучаснага стану рынку працы паведаміў Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр Беларусі, падчас пасяджэння прэзідыума Савета Міністраў, прысвечанага вынікам сацыяльна-эканамічнага развіцця за студзень — красавік гэтага года і пытанням забеспячэння росту заробатнай платы, стварэнню новых працоўных месцаў і працаўладкаванню грамадзян.**

«Станоўчая дынаміка росту эканомікі ў красавіку захавалася. Валавы ўнутраны прадукт дадаў яшчэ 0,2% і за чатыры месяцы склаў 100,5%. У прагнозных параметрах знаходзіцца і інфляцыя. Спажывецкія цэны за красавік выраслі на 0,7%, за чатыры месяцы — на 2,4%», — заявіў прэм'ер. Што да паказчыкаў па знешнім гандлі, прадукцыйнасці працы, замежных інвестыцыях, заробатнай плаце, фінансавых, то дынаміка па ўсіх — станоўчая. За першы квартал з сямі найважнейшых параметраў развіцця выканаты шэсць. Экспарт вырас на 20,7%, станоўчае сальда склала $192 млн ці 1,6% ВУП. Таксама рост назіраецца ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы. Не выкананы паказчык па рэальных грашовых даходах насельніцтва — 97,8% да ўзроўню мінулага года, пры гэтым рэальная заробатная плата ў параўнанні з першым кварталам мінулага года павялічылася на 1%. На думку Андрэя Кабякова, адставанне па даходах насельніцтва адбываецца з-за зніжэння ставак па дэпазітах, «што ў цэлым для эканомікі ацэньваецца станоўча».

Яшчэ адно з ключавых пытанняў работы ўрада — стварэнне новых працоўных месцаў. «Заданні па матрыцы ключавых паказчыкаў амаль усімі выконваюцца, толькі ў Мінскай вобласці невялікае недавыкананне. Але праблемы эфектыўнай занятасці не вырашаны. На рынку працы захоўваецца дысбаланс: за першыя чатыры месяцы гэтага года на 7600 чалавек звольнена больш, чым узята на работу», — падкрэсліў Андрэй Кабякоў. Толькі за мінулы год з эканомікі без уліку тых, хто выбыў па натуральных прычынах (выхад на пенсію ці смерць), выбыла больш за 35 000 чалавек.

«Разам з тым сёння рынак працы паступова стабілізуецца, — адзначыла **Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны.** — Ёсць станоўчая дынаміка і ў стварэнні новых працоўных месцаў — больш за 15 000 за першы квартал. Пры гэтым амаль 56% — гэта працоўныя месцы на новых прадпрыемствах».

Андрэй Кабякоў даручыў кіраўнікам рэгіёнаў больш глыбока і дэталёва разабрацца з тым, што адбываецца на рынку працы, а міністру працы і сацыяльнай абароны ў сваім дакладзе даць ацэнку рэальнаму стану спраў у гэтай сферы.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## У выніку выбуху ў дыпквартале Кабула загінулі больш як 90 чалавек



Пры гэтым яшчэ 380 атрымалі раненні. Магутны выбух у цэнтры Кабула адбыўся побач з прэзідэнцкім палацам і замежнымі пасольствамі. Бомба была закладзена ў вадавоз. Відавочцы паведамляюць, што выбух быў такой магутнасці, што ў радыусе сотняў метраў аказаліся выбіты вокны і знесены дзверы з завес. Назіральнікі схільныя разглядаць тое, што адбылося, як частку традыцыйнага «вясновага наступлення» руху «Талібан». Дарэчы, у апошнія месяцы ў Кабуле неаднаразова адбываліся напады, у выніку якіх гінулі людзі.

## ЗША паспяхова выпрабавалі сістэму перахопу міжкантынентальных ракет

Выпрабаванні сістэмы супрацьракетнай абароны былі праведзены ў Ціхім акіяне. Як заявіў тэлеканалу NBC News дырэктар Агенцтва па супрацьракетнай абароне ЗША віцэ-адмірал Джым Сірынга, тэст па перахопе міжкантынентальнай ракеты — важная падзея, якая дэманструе надзейнасць у адбіцці рэальнай пагрозы. Падчас выпрабавання ракета-перахопнік, запушчаная з падземнай шахты на базе ВПС ЗША Ванденберг у Каліфорніі, паспяхова накрыла мішэнь, што стартавала з атола Кваджалейн (Маршалавы астравы) прыкладна за 7500 кіламетраў. Адзначаецца, што вучэнні былі праведзены ў адказ на чарговы запуск у КНДР балістычнай ракеты.

## Жыхар Швейцарыі атрымаў штраф за «лайк» у Фэйсбуку

Суд у Цюрыху вынес абвінаваўчы прысуд 45-гадоваму мужчыну і абавязаў яго выплаціць штраф у памеры 4 тыс. франкаў (4,1 тыс. долараў). Швейцарац паставіў «лайк» да каментарыяў актывістаў, якія абвінавачвалі кіраўніка асацыяцыі па абароне жывёл Эрвіна Кеслера ў расізме і антысемітызме. У адказ на гэта Кеслер падаў у суд не толькі на аўтараў каментарыяў, але і на таго, хто іх «залайкаў», растлумачыўшы гэта тым, што «лайк» прасоўвае публікацыю і робіць яе бачнай для большай колькасці карыстальнікаў.

## Летась загінула амаль трэць каралаў Вялікага Бар'ернага рыфа

Абескаляроўванне каралаў, якое адбываецца пад уздзеяннем занадта высокай тэмпературы вады, прыводзіць да іх вымірання. Каралы слабеюць і губляюць каляровыя водарасці, якія пакрываюць іх паверхню, — гэта крыніца кіслароду і пажыўных рэчываў. Найбольш пацярпелі раёны каля берагоў горада Порт-Дуглас: там загінула да 70% каралаў.



■ Надвор'е

# Лета чакаецца цяплейшым

## А ападкаў будзе менш за кліматычную норму

**Лета ў гэтым годзе ў Беларусі чакаецца крыху цяплейшым, чым звычайна, паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый Рабаў.**



Фота Івана КУПАРВАСА.

Сярэднесезонная тэмпература паветра на большай частцы краіны чакаецца на паўградуса, а па паўднёва-заходняй палове — на градус вышэйшая за норму (норма — плюс 16,8). Колькасць ападкаў чакаецца меншая за норму (норма 244 мм). Яны на працягу сезона будуць размяркоўвацца нераўнамерна. Па словах Дзмітрыя Рабава, ліўневыя дажджы гэтым летам нярэдка будуць суправаджацца навальніцамі, шкваламі, а часам і градам. Не абыдзецца ў летні перыяд і без спёкі, што нам забяспечаць блакіруючыя антыцыклоны, якія не будуць пускаць у краіну вільготныя паветраныя масы. Чакаецца некалькі хваляў спёкі працягласцю не большай за тыдзень. У сувязі з глабальным пацяпленнем так званыя блакіруючыя антыцыклоны сталі з'яўляцца часцей, менавіта яны ўтрымліваюць у нас сухое і гарачае надвор'е летам. Пры гэтым устанаўліваецца высокая і надзвычайная пажаранебяспека.

Самае цёплае лета назіралася ў 2010 годзе, калі ў сярэднім па краіне тэмпература паветра за сезон дасягнула плюс 20,6 градусаў і ўсе летнія месяцы былі цяплейшыя, чым звычайна, асабліва чэрвень з сярэднямесячнай тэмпературай паветра плюс 22,6. Ён стаў самым цёплым месяцам за ўвесь перыяд назіранняў (на 4,8 градуса вышэй за кліматычную норму). Самы дажджлівы летні сезон, з колькасцю ападкаў у 335 мм, быў у 1998 годзе. Менш за ўсё — 111 мм ападкаў — назіралася за лета 1992 года.

Дзмітрый Рабаў таксама расказаў, якое надвор'е чакаецца ў кожным летнім месяцы. Так, у чэрвені сярэдняя месячная тэмпература паветра на большай частцы краіны прагназуецца на 0,5 градуса, а на захадзе на 1 градус вышэйшая за кліматычную норму (норма 15—17 градусаў цяпла). Але пры гэтым месячная колькасць ападкаў мяркуецца меншая за кліматычную норму (норма 69—87 мм). Сярэдняя месячная тэмпература паветра ў ліпені чакаецца на большай частцы на адзін градус вышэй за кліматычную норму, а па паўночным усходзе — вышэйшая на паўградуса (норма 17—19 градусаў вышэй за нуль). Месячная колькасць ападкаў чакаецца меншай за сярэднія шматгадовыя значэнні (норма 74—97 мм). Сярэдняя месячная тэмпература паветра ў жніўні таксама прагназуецца на 1 градус вышэйшая за кліматычную норму (кліматычная норма плюс 16—17 градусаў). Месячная колькасць ападкаў прагназуецца ў межах сярэдніх шматгадовых значэнняў, па паўднёвай палове — большая за норму (кліматычная норма 62—89 мм).

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Фестывалім!

# Дзяцінства запрасіла на свята

**На працягу чатырох першых дзён чэрвеня ў Клімавічах зноў будзе панаваць прыгожы міжнародны дзіцячы фестываль «Залатая пчолка». Сёлета ён збярэ больш як 700 удзельнікаў з 8 дзяржаў — Беларусі, Расіі, Украіны, Кыргызстана, Малдовы, Румыніі, Фінляндыі і ўпершыню — Сербіі. За 16 гадоў свайго існавання ён пабачыў тысячы юных талентаў з дзясяткаў краін свету. Яго лаўрэатамі ў розныя гады станавіліся зоркі дзіцячага Еўрабачання Ксенія Сітнік, Андрэй Кунец, Ганна Мушак, Лідзія Заблоцкая і іншыя.**

— Гэта ўжо не проста свята, гэта брэнд раёна, — кажа **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама Кацярына МУЗЫЧЭНКА.** — Вялікае значэнне надае фестывалю ўрад краіны, які прыняў рашэнне пачынаючы з гэтага года праводзіць яго кожны год. Дзякуючы фестывалю пра Клімавічы цяпер ведаюць далёка за межамі нашай краіны. На працягу некалькіх гадоў нам дапамагаюць фарміраваць прызавыя фонды еўрапейскія, у прыватнасці нямецкія, ротары-клубы. Яшчэ ні адно дзіця не паехала з фестывалю без нейкага сувеніра. Гэта свята, радасць, новыя знаёмствы, а галоўнае — станоўчы імідж Беларусі.

Фестываль у Клімавічах — моцная стартавая пляцоўка для пачаткоўцаў. Адзнаку эстраднаму і харэаграфічнаму выкананню дасць кампетэнтнае міжнароднае журы на чале з заслужаным дзеячам культуры Рэспублікі Беларусь Святланай Стацэнкай (у жанры вакальнае мастацтва) і старшынёй асацыяцыі фальклорных груп Балгарыі Росенам Багданавым (харэаграфічнае мастацтва).

Цікавым будзе адкрыццё фестывалю. Пры дапамозе спецыяльных сцэнічных прыёмаў і эфектаў яно будзе нагадваць кругасветнае падарожжа з удзелам вялікай колькасці казачных персанажаў. Навінка форуму — правядзенне дзён маладосці, на якія запрошаны члены маладзёжнага парламента з Бранскай вобласці. Падчас фестывалю плануецца падпісаць дагавор аб супрацоўніцтве ў сферы маладзёжнай палітыкі. На працягу чатырох дзён на пляцоўках «Залатой пчолкі» будуць працаваць розныя экспазіцыі, выстаўкі і майстэрні, будзе арганізаваны шырокі продаж сувенірнай прадукцыі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ А вы ведалі?

# Чвэрць зуброў свету — беларускія

**Доля пагалоўя зуброў у Беларусі складае больш за 25 працэнтаў ад сусветнай колькасці, паведамілі ў Міністэрстве прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

З моманту рэалізацыі Праграмы па захаванні, рассяленні і выкарыстанні зубра ў Беларусі 1994—1998 гг. у краіне адзначаецца ўстойлівы станоўчы рост пагалоўя жывёл, колькасць якіх за 22-гадовы перыяд узрасла больш чым у чатыры разы і па стане на першага лютага гэтага года дасягнула 1574 асобін.

Тым самым пастаўленая ў Канцэпцыі захавання і ўстойлівага выкарыстання зуброў у краіне і зацверджаная ў 2012 годзе Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь задача па забеспячэнні далейшага росту і стабілізацыі колькасці беларускай папуляцыі зуброў на тэрыторыі краіны на ўзроўні, які гарантуе яе доўгатэрміновае выжыванне (1500 асобін), паспяхова выкананая. Беларусь з'яўляецца першай у свеце краінай па колькасці вольнажывучых зуброў, пры гэтым доля пагалоўя віду складае больш за 25 працэнтаў ад сусветнай колькасці.

Разам з тым існуе шэраг праблем, звязаных з уплывам зуброў на прыродныя экасістэмы і аграландшафты, станам асобных (Барысаўска-Бярозаўскай) мікрапапуляцый і «прыпяцкіх» груповак жывёл, устойлівым выкарыстаннем іх рэсурсаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### ПАДАРУНАК ВЕТКАЎСКІМ МАЛЯНЯТАМ

**Яслі-сад №1 пасля рэканструкцыі адкрыліся ў Ветцы.**

Менш чым год таму дзіцячую ўстанову закрылі з-за аварыйнага стану, і вось цяпер яна зноў прымае маленькіх выхаванцаў. Разлічана памяшканне на 61 дашкольніка ад двух да шасці гадоў.

Начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму Веткаўскага райвыканкама Сяргей Любімаў паведаміў, што на рамонтныя работы са сродкаў абласнога бюджэту выкарыстана BYN1 млн 490 тыс. У рэкордна сціслыя тэрміны не толькі праведзена мадэрнізацыя двухпавярховага будынка плошчай звыш 960 кв.м, але і добраўпарадкавана і абгароджана ўся тэрыторыя. У харчаблоку, пральні, музычнай і фізкультурнай залах з'явілася сучаснае тэхналагічнае абсталяванне. Цяпер тут ёсць яшчэ і кабінеты псіхолага і лагапеда. Дарэчы, у раёне на найбліжэйшы час запланаваны рэканструкцыя і капітальны рамонт яшчэ трох устаноў адукацыі: гімназіі, Радужскай і Столбунскай сярэдніх школ.

### ЛЯЧЫЦЦА ПОБАЧ З ДОМАМ

**У новым мікраранёне Гомеля, дзе актыўна ідзе забудова, адкрываецца педыятрычнае аддзяленне філіяла №2 Гомельскай цэнтральнай гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі.**

Галоўны ўрач установы аховы здароўя Таццяна Салодкая расказала, што аддзяленне размешчана ў прыстасаваным памяшканні па вуліцы Жамчужнай у Навабеліцкім раёне абласнога цэнтра. На яго базе абсталяваны тры кабінеты ўчастковых урачоў-педыятраў, клініка-дыягнастычная лабараторыя, працэдурны кабінет, кабінет афармлення даведак і лісткоў непрацаздольнасці. Рамонтныя работы ў выдзеленым памяшканні ішлі пяць месяцаў і былі праведзены гаспадарчым спосабам. З гарадскога бюджэту на гэтыя мэты было выдзелена BYN4,5 тысячы. На набыццё мэблі і медыцынскага абсталявання — BYN29,2 тысячы.

У зону абслугоўвання аддзялення ўвайшлі новыя мікраранёны №94, 96, 104, а таксама мікрараён Крышталь, дзе пражываюць сем тысяч юных гамяльчан. Да таго ж, радыус абслугоўвання скараціўся з сямі да трох кіламетраў, што куды больш зручна бацькам немаўлят. Запісацца на прыём да ўрача ў новым аддзяленні можна не толькі па тэлефоне і пры асабістым звароце, але і з дапамогай інтэрнэт-рэгістратуры. У самых блізкіх планах — далучэнне да сістэмы электроннага рэцэпта.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

### АЛІМПІЙСКАЯ ЧЭМПІЁНКА РАЗВІТАЛАСЯ З ВЯЛІКІМ СПОРТАМ

**Чэмпіёнка Алімпійскіх гульняў у Афінах у бегу на сто метраў Юлія Несцярэнка прыгожа завяршыла сваю спартыўную кар'еру.**

Учора на стадыёне «Брэсцкі» яна правяла сімвалічны забег на любімую стометроўку ў кампаніі спартсменак-пачаткоўцаў. Потым тытулаваную бягунню, ганаровага грамадзяніна Брэсцкай вобласці, ушанавалі ў гарвыканкаме. Было сказана шмат добрых, шчырых слоў, выказана нямала пажаданняў паслужыць спорту ўжо ў іншай якасці.

Пасля заваявання алімпійскага золата Юлія не проста працягвала трэніравацца, выступаць на рознага кшталту спаборніцтвах — яна стала сапраўдным грамадскім дзеячам, прапагандыстам развіцця спорту і алімпійскага руху ў краіне.

Юлія Віктараўна наведвала школы, дзіцячыя садкі, аздараўленчыя лагеры, дамы-інтэрнаты, арганізоўвала самыя розныя турніры і спаборніцтвы, праводзіла майстар-класы, дарыла дзецям падарункі. На яе прызы праводзіцца легкаатлетычны турнір у Брэсце. Шматлікія мерапрыемствы традыцыйна плануецца з удзелам Юліі Несцярэнкі. У далейшым Юлія бачыць сябе на трэнерскай рабоце.

Яна па-ранейшаму застаецца сціплым, добразычлівым, абаяльным чалавекам. А званне алімпійскага чэмпіёна — гэта назаўсёды.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*



Фота БЕЛТА.

### СТУДЭНТКА ВНУ РАСПАЎСЮДЖВАЛА СПАЙСЫ

**У сталіцы затрымалі студэнтку адной з мінскіх вышэйшых навучальных устаноў, якая падазраецца ў распаўсюджванні псіхатропных рэчываў, а таксама двух яе пакупнікоў.**

Супрацоўнікі міліцыі заўважылі двух мужчын, якія падазрона сябе паводзілі, перасоўваючыся па горадзе пры дапамозе тэлефоннага навігатара. Яны на непрацяглы час зайшлі ў адзін з пад'ездаў жылога дома па вуліцы Матусевіча, а калі выйшлі адтуль, былі затрыманы. Было ўстаноўлена, што ў пад'ездзе грамадзяне — 25-гадовы мінчанін і 39-гадовы жыхар Мінскага раёна — забралі з тайніка спайс. У гэтым жа пад'ездзе праваахоўнікі ўстанавілі кватэру, якую здымала 20-гадовая жыхарка Гродзенскай вобласці, студэнтка другога курса адной з ВНУ сталіцы. Як мяркуецца, яна займалася збытам асабліва небяспечных псіхатропных рэчываў у інтэрнэце шляхам так званых закладак. Па інфармацыі Фрунзенскага РУУС г. Мінска, падчас вобыску ў кватэры было знойдзена больш за 18 грамаў спайса. Дзяўчыне можа пагражаць пазбаўленне волі тэрмінам да 15 гадоў. Пакупнікам — тэрмін да пяці гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ 50+

# ЛЕКІ АД САМОТЫ

## Маленькая гісторыя пра сяброўства і крыху жыццёвай філасофіі

**Калі мы былі дзецьмі, новыя сябры з'яўляліся так лёгка, што мы наогул над такімі пытаннямі не задумваліся. У дарослым узросце, як правіла, набыць сяброў значна цяжэй. Усе здаюцца нейкімі недастаткова шчырымі, вернымі, недастаткова блізкімі... Наогул, упусціць у сваё жыццё новага чалавека становіцца складаней. Прыяцелі, знаёмыя, сумесныя паходы ў кіно і нават паездкі ў адпачынак... Але няма таго глыбокага і жывога, што аб'ядноўвала б і чапляла за душу. Тым каштоўнейшыя прыклады новага сяброўства ва ўзросце за 50, якія час ад часу падкідвае жыццё. Як у 79-гадовай Славы ГУБІЧ і 64-гадовай Тамары ПАПКОВІЧ з Мінска, напрыклад...**

### Такія розныя сяброўкі

Жанчыны пазнаёміліся і пасябравалі ў Школе здароўя, у якую разам хадзілі ва Універсітэце трэцяга ўзросту. «Мы нават ехалі ў адным тралейбусе на першы занятак», — усміхаецца Тамара. «Ты яшчэ, дарагая, скажы, што мы адстаялі чаргу ў 200 чалавек, каб паступіць туды», — уступае ў размову Слава Вікенцьеўна. «Так, у той год запіс ажыццяўляўся толькі на працягу двух дзён, таму былі вялікія чэргі, — тлумачыць Тамара. — А ў Школе здароўя мы селі за адзін стол, так і пазнаёміліся».

Праўда, праз чатыры месяцы Слава зламала руку і перастала наведваць заняткі, але кантактаваць жанчыны не кінулі. Тэлефанавалі адна адной, сустракаліся, дзяліліся навінамі. «Нас абедзвюх хвалявалі пытанні здароўя. У Школе здароўя мы атрымлівалі дамашнія заданні, якія трэба было выконваць, — разам абмяркоўвалі іх. У нас цяга адна да адной з'явілася», — у адзін голас кажуць яны.

Зараз агульныя заняткі ва Універсітэце трэцяга ўзросту Славу і Тамару быццам бы ўжо не звязваюць, але «старая дружба не ржавее». Тым больш што сяброўкі спадзяюцца пайсці зноў вучыцца.

— Калі ты ўжо на пенсіі і не працуеш, гэта выдатна — знайсці новыя інтарэсы і круг зносін, — дзеліцца Тамара Папковіч. — Я вось вучылася ў Школе здароўя. Мы там і пераломы праходзілі, і гіпертанію, і шмат іншых тэм. А ў мінулым годзе я хадзіла на камп'ютарныя курсы. Потым чатыры месяцы — з кастрычніка па студзень — вучылася, як карыстацца андроідам. Мне якраз сястра са сваёй сям'ёй падарыла на дзень нараджэння смартфон, дзе ўсталявана гэтая праграма. Так што навучанне, як ім карыстацца, было вельмі дарэчы... Вывучала ва Універсітэце трэцяга ўзросту і сусветную мастацкую культуру. З намі займаліся валанцёры.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Вельмі пазнавальна ўсё расказвалі, паказвалі...

***

Яны такія розныя! Слава — каталічка, Тамара — праваслаўная. Слава — гуманітарый, артыстычная натура з цягай да драматычнага лексікону, любіць спяваць рамансы. «Я дагэтуль кажу люстэркам: вы пастарэлі, а я не!» — смяецца яна. Тамара — спакойная, ураўнаважаная, з дзяцінства займаецца спортам, па адукацыі інжынер-будаўнік.

У Славы ў 2014 годзе было залатое вяселле: 50 гадоў з мужам разам пражылі, выгадавалі дваіх сыноў. Малодшага яна нарадзіла ў 45 гадоў. «Можа, таму Бог даў мне такое доўгае актыўнае жыццё», — кажа жанчына. Яна ўвесь час мае патрэбу ў камплiментах. «Учора кажу мужу: ты мне раз на год скажаш, што любіш, а мне гэтага мала! *(смяецца)*. Ты мне крычы наўздагон: «Славачка, адзіная, кахаю, хутчэй вярніся!» Як ён рагатаў! Майму мужу 83 гады. Ён энергетычна насычаны чалавек, я дагэтуль, калі ён бярэ мяне пад руку, адчуваю сілу, што зыходзіць ад яго...»

Тамара сваёй сям'ёй так і не абзавялася. «У мяне толькі кот, — усміхаецца яна. — Усё жыццё я пражыла з бацькамі. Цяпер іх ужо няма. Але я не шкадую ні аб тым, што збылося, ні аб тым, што не спраўдзілася. Наогул, некалі мы жылі адзінаццаць чалавек у трохпакаёвай кватэры: я, бацькі, брат і сястра са сваімі сем'ямі. Таму насамрэч я большую частку жыцця пражыла ў сям'і і побач з дзецьмі, сваімі пляменнікамі...»

### Жыццёвая філасофія...

**...ад Тамары**

— Я адзін час хадзіла на лекцыі ў Духоўную акадэмію пры мінскім Кафедральным саборы. І там пачула словы, якія мне падаліся вельмі дакладнымі. Матушка Маша сказала, што нам трэба адказваць за ўсе свае ўчынкі. Не апраўдваць сябе тым, што вам нехта параіў так зрабіць ці так рабіла ваша мама. Вам толькі паралі, а зрабілі — вы. І вы за свае ўчынкі перад Богам у адказе. Ён не будзе цікавіцца, хто вам што раіў. Вы прынялі гэта рашэнне, вы зрабілі гэта. І павінны несці сваю асабістую адказнасць за любы свой учынак, як бы вам часам ні хацелася перакласці яе на кагосьці іншага. І я падумала: так яно і ёсць. Гэта вельмі мудрыя словы. Я думаю, менавіта так трэба ісці па жыцці: нікога не абвінавачваючы.

**...ад Славы**

— А мне ксёндз неяк сказаў: «Шчаслівых Бог не судзіць». Я вельмі моцна запомніла гэтыя словы.

Мая жыццёвая філасофія такая: з радасцю трэба імкнуцца сябраваць — самой радавацца і іншых радаваць! Мяне многа што ў жыцці радуе. Нават з'яўленне першых лісточкаў вясной. Гэта ж такі цуд! А першая чаромха!.. Яшчэ трэба часцей хваліць сябе.

— За што сябе апошні раз хвалілі, памятаеце?

— Днямі пахваліла сябе, калі мне мужчына, таксама ва ўзросце, сказаў камплімент. Я ехала ў электрычцы, а ён падсеў да мяне, мы сталі размаўляць, а потым ён сказаў: «З вамі так прыемна гутарыць і вельмі прыемна на вас глядзець...». Гэта такі рэдкі камплімент. І я была вельмі задаволеная, сказала сама сабе: «Малайчына, так трымаць!»

**...і зноў ад Тамары:**

— Трэба вучыццаператвараць у жарты нават непрыемныя моманты, імкнуцца не заводзіцца, не адказваць на зло. Памятаю, я неяк вярталася дадому пасля заняткаў скандынаўскай хадой, з палкамі для гэтай самай хады. Села ў тралейбус. А на наступным прыпынку ўвайшоў пажылы мужчына, і нейкі ён быў вельмі раздражнёны, злы. Паглядзеў на мяне нядобра і кажа: «Ну, а вы, спартсменка, з палкамі, маглі б і пешшу прайсці».

Я разумею, што выклікала ў яго нейкія адмоўныя эмоцыі, але адказваю: «Ведаеце, я сёння ўжо адхадзіла сваю норму, мне больш не трэба. Але ў мяне яшчэ праязны на два віды транспарту ёсць, трэба і яго яшчэ ад'ездзіць». Ён тады шчыра засмяяўся і кажа: «Ну, калі праязны, тады вядома...».

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

❍ **Даведка «Звязды»**

### ШУКАЙЦЕ СЯБРОЎ У ЛЮБЫМ УЗРОСЦЕ

**Мы запыталі ў мінскага псіхолага Аляўціны ГРЫЦЫШЫНАЙ, як адзінокаму чалавеку выйсці з ізаляцыі і дзе можна знайсці сяброў.**

— Дзіўна, але многія людзі ўсур'ёз мяркуюць, што сапраўднае сяброўства немагчыма завесці ў сталым узросце, тым самым прысуджаючы сябе да адзіноты. На самай справе пры наяўнасці жадання і адкрытага сэрца можна выбудаваць трывалыя сяброўскія адносіны ў любым узросце.

Па-першае, азірніцеся вакол. Напэўна, вы ўбачыце ў сваім асяроддзі аднаго-двух чалавек, якія вам здаюцца больш прыемнымі, чым іншыя людзі. Ці можаце выбраць сабе нейкія курсы па інтарэсах — будзеце прыглядаць сабе сяброў там.

Пачніце павольна збліжацца з тымі, хто вам больш сімпатычны. Рабіце гэта не дакучліва. Часам кажыце кампліменты з нагоды знешняга выгляду і поспехаў. Праз пару тыдняў — месяц пачніце задаваць пытанні пра інтарэсы, захапленні. Глядзіце на рэакцыю. Калі суразмоўца вам усміхаецца, вітаецца, цікавіцца вамі ў адказ — вы на правільным шляху.

Паступова размаўляйце больш і часцей. Не спяшаючыся, пашырайце дыяпазон тэм. Як-небудзь прапануйце разам схадзіць на выстаўку, у кіно, кафэ ці на якое-небудзь мерапрыемства. Такім чынам вы завяжаце прыяцельскія адносіны, якія з часам могуць перарасці ў сяброўства.

Звяртайце ўвагу на дробязі, якія фарміруюць уяўленне пра вас як пра чалавека. Будзьце пунктуальнымі, не перапыняйце суразмоўцу падчас размовы, асцярожна звяртайцеся з крытыкай, не вучыце жыццю нікога без яго просьбы, не падкрэслівайце сваю перавагу над чалавекам...

Будзьце цікавыя людзям. Для гэтага трэба быць цікавым у першую чаргу сабе. Чытайце кнігі, хадзіце ў кіно, тэатры, асвойце новае рамяство, хобі. Не сядзіце дома ў чатырох сценах — так вы прывыкаеце да ізаляцыі. Замест гэтага праяўляйце шчырую цікаўнасць да тых, хто вам сімпатычны.

Бывае так, што чалавек вам спадабаўся, але не ідзе на кантакт. У гэтым выпадку паспрабуйце зменшыць тэмп. Тут ёсць два магчымыя варыянты — або чалавек баіцца зблізацца, або вы яму не вельмі падабаецеся. У першым выпадку вам спатрэбіцца больш часу на наладжванне адносін. У другім — не марнуйце свае сілы на тое, каб зацікавіць і спадабацца.

■ З нагоды

# МЫ ІМ ПАТРЭБНЫЯ...

## Пра ўсынаўленне, міжнародную апеку і гульню ў гандбол



**Цікавасць беларусаў да ўсынаўлення павялічваецца, а таямніца ўсынаўлення за апошнія 10 гадоў трансфармуецца ў адкрыты працэс, калі створаныя такім чынам сем'і самі жадаюць сказаць, што яны ёсць. У той жа час айчынная сістэма аховы дзяцінства зацікаўлена перш за ўсё ў тым, каб дзеці заставаліся ў іх біялагічных сем'ях. Пра гэта і некаторыя асаблівасці святкавання Дня абароны дзяцей напярэдадні 1 чэрвеня расказалі спецыялісты.**

Па запрашэнні Міжнароднай асацыяцыі дзіцячых фондаў дэлегацыя дзяцей-сірот і малых, што засталіся без бацькоўскай апекі, Гомельскай вобласці адзначыць свята ў Маскве. У Гомельскім палацы творчасці дзяцей і моладзі арганізуюць «Адну радасць для ўсіх». А ў Магілёўскай вобласці зладзяць мерапрыемствы для выхаванцаў дзіцячых дамоў сямейнага тыпу.

— Права апякаць малых, што засталіся без бацькоўскага клопату, даецца перш за ўсё іх сваякам. Аднак не менш важна, што існуе магчымасць міжнароднай апекі дзяцей, — расказаў **Міхаіл ЧАРАПЕННІКАЎ, дырэктар Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Міністэрства адукацыі Беларусі.** — Летась 27 дзетак знаходзіліся пад такой апекай. Важны момант таксама — ахова маленькіх беларусаў, якія засталіся без бацькоўскай апекі на тэрыторыі замежных дзяржаў. Практычна заўжды ў такіх выпадках палітыка дзяржавы скіравана на вяртанне такіх дзяцей у краіну. За 2016 год у краіну вярнуліся 17 такіх дзетак, а за першае паўгоддзе 2017-га — чацвёра.

Прыярытэт аддаецца нацыянальнаму ўсынаўленню (559 малых беларусы ўсынавілі летась і ўжо 125 — сёлета). Тым не менш бацькоў у Італіі, з якой у Беларусі падпісана міжурадавае пагадненне аб магчымасці міжнароднага ўсынаўлення, у 2016-м знайшлі 94 дзіцяці, да мая 2017-га — 15.

— Сумесна з прадстаўніцтвам дзіцячага фонду ААН у Беларусі ажыццяўляецца ініцыятыва «Горад, дружалюбны да дзяцей», да якой далучыліся ўжо 25 гарадоў, — заўважыла **Алеся БЕРАСНЕВА, галоўны спецыяліст упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі.** — А з 2016-га ў межах праграмы па стварэнні здароўезберагальнага асяроддзя ў школах дзейнічаюць праекты «Здаровая школа» і «Здаровы клас».

Сёлета **выхаванцаў дамоў-інтэрнатаў** чакае другая частка **сацыяльнага праекта «Каманда мары».** Летась хлопцы-сіроты гулялі ў футбол, а сёлета яны зоймуцца гандболам.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

# ПАЛАЦ ШУКАЕ СПОНСАРА

## Ад Трабскіх і Хадкевічаў да Сапегаў і Булгакаў

Тутэйшымі землямі з пачатку XV стагоддзя валодалі прадстаўнікі розных знатных сем'яў — Сякіры, Трабскія, Гаштаўты, Хадкевічы. Гетман Ян Хадкевіч пабудаваў у гэтым месцы земляную крэпасць, аб былой моцы якой сёння нагадваюць пагоркі і адхоны. Ад Хадкевічаў маёнтак Добасна — як яго яшчэ называюць па прывязцы да населенага пункта, які раней уваходзіў у яго склад — пераходзіць да Сапегаў. І ўжо Франц Сапега прадае яго двум братам Булгакам, адстаўным ваенным. Браты мараць стварыць тут рэзідэнцыю, але хутка паміраюць. Маёнтак дастаецца іх пляменніку Ігнацыю, вельмі адукаванаму маладому чалавеку. У 1823 годзе ён быў абраны Бабруйскім павятовым прадвадзіцелем дваранства — маршалкам і для ўмацавання свайго статусу пачаў будаваць палац. У той жа год ён бярэцца шлюбам з прадстаўніцай вельмі багатага роду Ізабэлай Слізень. І, кажуць, зусім не каханне кіравала маладым чалавекам. Усе багацці, якія захоўваліся ў палацы, — 18 слуцкіх паясоў, 6 тысяч старадрукаваных і рукапісных кніг, сярэднявечная зброя, прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і гэтак далей, — усё належала Слізням, і толькі потым перайшло Булгакам. Палац у сярэдзіне XIX стагоддзя быў цэнтрам грамадскага жыцця. Усе шляхцічы і дваране з'язджаліся сюды на балі і паляванне. Бо побач быў раскошны парк з цэлым каскадам штучных вадаёмаў.



А столь як новая.

Першапачаткова планавалася пабудаваць звычайны класічны палац з двума бакавымі флігелямі і бельведэрам. Крыху пазней да галоўнага корпуса дабудоўваюцца яшчэ дзве лініі з галерэйнымі памяшканнямі і дамавой царквой. Гэта культавая ўстанова захавалася і сёння бянтэжыць турыстаў сваім усёвідушчым вокам на фасадзе. Ёсць меркаванне, што Булгакі былі масонамі. Гісторыкі гэтую ідэю не аспрэчваюць, але і не пацвярджаюць. Усёвідушчае вока — гэта старадаўні хрысціянскі знак. Але ў якім кантэксце яго выкарыстоўвалі апошнія гаспадары, невядома. У пачатку XX стагоддзя палац упрыгожвала яшчэ і аранжарэя са шкляным дахам. Яе для Булгакаў рыхтавалі па спецыяльным заказе ў Варшаве. Але пасля рэвалюцыі мясцовыя сяляне хутка прыбралі да рук дэфіцытнае шкло. А немцы падчас вайны разабралі аранжарэю на цэглу для падсыпкі дарогі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Тэрміны пераносяцца

Пакуль цалкам адноўлена толькі заходняя частка будынка, апісання якой, на жаль, не захавалася. «Яна была пабудавана ў пачатку XX стагоддзя, калі перадапошні ўладальнік Эдгар Булгак вырашыў пашырыць палац і канчаткова яго замкнуць, — расказвае **галоўны спецыяліст Жыліцкага гістарычнага комплексу-музея Уладзіслаў КУЛАКЕВІЧ.** — Але пачалася Першая сусветная вайна, потым рэвалюцыя, і Булгакі так і не паспелі пачаць тут жыць. Пасля вайны ў гэтым крыле быў вялікі пажар і нічога з інтэр'ераў не захавалася».

Дзіцячая школа мастацтваў справіла наваселле ў адноўленым крыле палаца ў лістападзе 2011 года. А следам за ёй у 2013-м, калі быў здадзены першы этап другой чаргі, па суседстве размясціўся Жыліцкі гістарычны комплекс-музей і бібліятэка. Чарговым крокам павінна было стаць аднаўленне аранжарэі, але планы перамяніліся. Летась нават паднімалася пытанне занесці Жыліцкі палац у спіс аб'ектаў, рэканструкцыя якіх прыпынена. Але абышлося. Жыццё яго крыху падтрымалі 40 тысяч рублёў рэспубліканскага суботніка, якія выдзеліў Магілёўскі аблвыканкам, і дапамога магілёўскага прадпрыемства «Бабуліна крынка» ў суме 50 тысяч рублёў, таксама сабраных падчас суботніка. Абывацель не заўважыў прыкметных змен у знешнім выглядзе палаца. Але за кошт дапамогі атрымалася «пачысціць» ад старой тынкоўкі фасад галоўнага корпуса палаца.

— Першапачаткова па праекце трэцюю чаргу аб'екта планавалася здаць ужо да 2015 года, потым тэрміны адкладаліся спачатку да 2017-га, потым да 2018 года, зараз наогул вызначаных тэрмінаў няма, — кажа **начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Кіраўскага райвыканкама Андрэй КАРПУК.** — Былі перыяды, калі на работы выдзялялася старымі грашыма мільярд-паўтара. Але гэта для такога аб'екта кропля ў моры.

## Рамантуем порцікі, фарбуем фасад

Сёлета на аб'екце назіраецца ажыўленне. Дзяржава выдзеліла 300 тысяч рублёў, і працэс, як той казаў, пайшоў. Рэканструкцыю аб'екта вядзе магілёўскае прадпрыемства «Будпраектінвест». На яго рахунку палац Пацёмкіна ў Крычаве, рэканструкцыя магілёўскага музея Бялыніцкага-Бірулі — філіяла Нацыянальнага мастацкага музея, якая з-за недахопу сродкаў, на жаль, таксама зацягнулася. Не вельмі паспеюць развярнуцца будаўнікі і на Жыліцкім палацы. На гэтыя грошы яны абяцаюць адрамантаваць порцікі, пакласці каля 70% вонкавай тынкоўкі і зрабіць гідраізаляцыю падвала. Плюс працэнтаў на 10 ад агульнай патрэбы усталююць вокны. «Потым, хутчэй за ўсё, зноў будзе перапынак», — уздыхае **Валянцін НАВОЙЧЫК, прараб Будпраектінвеста.**

Вядома, што калі будаўнічыя работы расцягваюцца ў часе, гэта не на карысць будынку. Але музейныя работнікі супакойваюць, што палац не зімовы, што будаваўся ён з такім улікам, каб вытрымліваць перыяды без ацяплення. Маўляў, метровыя сцены (праз іх нават з цяжкасцю праходзіць сігнал мабільнага тэлефона) за лета насычаюцца цяплом і потым на працягу доўгай зімы паволі яго аддаюць. А зараз тут ёсць яшчэ і ацяпленне. Іншая справа, што яно не бясплатнае. А плошчы вымяраюцца тысячамі квадратаў.



Ад былых гаспадароў, на жаль, рэчаў не засталося.

Валянцін Навойчык кажа, што калі б ім разам далі ўсю суму, прадугледжаную для рэканструкцыі, за два гады аб'ект быў бы цалкам зроблены. Але дзе ж узяць гэтыя мільёны?

Цяпер па парадных залах палаца гуляць не дазваляецца, але для карэспандэнта «Звязды» зрабілі выключэнне. Падымаемся на другі паверх. Цэнтральная лесвіца, дарэчы, арыгінальная, зроблена з дуба. Але выгляд, мякка кажучы, непрэзентабельны. Можа, ад таго, што яе ў савецкі час няўдала пафарбавалі? Сцены моцна пашкоджаны, але, калі добра прыглядзецца, дзе-нідзе яшчэ засталася пазалота.

— Кажуць, тут усё было ў пазалоце, — каментуе прараб. — Госці падымаліся на другі паверх пад гукі музыкі. У савецкія гады балконы для музыкантаў былі знішчаны, але мы іх аднавілі.

Па бясконцай анфіладзе пакояў (а іх усяго ў палацы 100) можна меркаваць, з якім размахам жылі тут гаспадары. Распазнаць былую прыгажосць у гэтых паўразбураных памяшканнях цяжка, але немагчыма адарваць вачэй ад столяў. Ім больш за 150 гадоў, але фарбы такія насычаныя, што здаецца, былі пакладзены толькі ўчора. Час амаль не пашкодзіў гіпсавую ляпніну, але кесонныя столі ў савецкі перыяд разабралі. У бальнай і банкетнай зале будаўнікам прыйшлося зноў аднаўляць іх. У бальнай зале наогул столь была апушчана прыкладна на два метры.



А вось гэтай часткі палаца пакуль наогул няма.

Камінаў і іншых прыкмет раскошы пакуль няма. Тут усё залежыць ад фінансавання. Размаўляць пра гэта, калі адно акно для палаца каштуе 2,5 тысячы рублёў, нават непрыстойна. Наогул, трэба радавацца, што палац не быў знішчаны падчас вайны, што ў савецкія гады яго не перапланавалі да непазнавальнасці. Захаваліся лесвіцы і нават уваходныя дзверы. Адна іх палова зроблена так, каб яе можна было скласці, як кніжку.

## На што спадзявацца?

Для завяршэння трэцяй чаргі, над якой сёння працуюць будаўнікі, трэба яшчэ каля 12 мільёнаў рублёў. На жаль, нават такія дастаткова важкія ўліванні, як сёлетняе, — 300 тысяч рублёў, не даюць спадзяванняў на хуткі фініш. Не трэба быць матэматыкам, каб сказаць, што пры такім фінансаванні чакаць адкрыцця прыйдзецца 40 гадоў. Прагнозы здаюцца яшчэ менш аптымістычнымі, калі чуеш, што нават у лепшыя 2011—2013 гады на аб'ект выдзялялася па 400—500 тысяч (дэнамінаваных) рублёў.



Уладзімір БЕЛЫ: «Яшчэ 15 гадоў таму гэта быў адзін з уваходаў у тэхнікум».

А колькі яшчэ сродкаў спатрэбіцца, каб давесці да розуму закінуты парк плошчай 18 гектараў з каскадам штучных вадаёмаў? Усё гэта сёння таксама ў заняпадзе.

— У парку яшчэ захаваліся рэдкія пароды дрэў, тут сустракаецца сасна Веймутава, клён серабрысты, ёсць нават 300-гадовыя асіны, — кажа **дырэктар Жыліцкага сельскагаспадарчага каледжа Уладзімір БЕЛЫ.** Установа, якой ён кіраваў, толькі ў 2002 годзе пераехала з палаца ў новы будынак па суседстве. «На жаль, сёння гэты парк хутчэй нагадвае лес, — уздыхае ён. — Але можна ўявіць сабе, як прыгожа тут было ў лепшыя дні. Пры пане кожныя тры гады вада ў вадаёмах спускалася і наводзіўся парадак».

Навучэнцы каледжа і супрацоўнікі музея па меры сіл падтрымліваюць парадак на прылеглых тэрыторыях. Але аб'екту патрэбна больш істотная дапамога.

— Сёння інфармацыя пра наш палац ёсць усюды, — кажа ідэолаг раёна Андрэй Карпук. — І яна працуе. Кожную суботу прыязджае па тры—чатыры вясельныя картэжы з Мінскай і Гомельскай абласцей. Але інвестараў пакуль няма. Сваякі Булгакаў жывуць у Польшчы, але яны не багатыя, каб нам дапамагчы. Паказваем Жылічы ўсім афіцыйным гасцям. Сёлета, напрыклад, азербайджанцы прыязджалі. З боку Бабруйска пры ўездзе ў Кіраўск установілі білборд. Будзем звяртацца да нашых калег з Рагачоўскага раёна, каб таксама ўстанавілі паказальнік. На іх тэрыторыі праходзіць траса, ад якой да палаца ўсяго пяць кіламетраў. Распрацаваны турыстычныя маршруты, але на тэрыторыі аграгарадка няма ні гасцініц, ні рэстарана. І гэта таксама праблема. Калі быў бы адрамантаваны галоўны корпус, можна было б арганізаваць фестываль у панскім стылі, з рыцарамі, баламі. Мы працуем і над гэтай ідэяй.

На тое, што раёну патрэбна дапамога па рэканструкцыі палаца, звяртаюць увагу і вучоныя.

— Жыліцкі палац сапраўды ўнікальны, але, на жаль, рэдка трапляў у сферу інтарэсаў навукоўцаў, — адзначыў **Сяргей ГАРАНІН, намеснік дырэктара па навуковай рабоце філіяла Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.** — Аб'ект не ў благім стане, але рэстаўрацыйныя работы, арганізацыя культурнага жыцця на сённяшні дзень патрабуе і навуковага суправаджэння. Навука робіцца ўсё больш важным фактарам ва ўсіх галінах жыцця, у тым ліку і ў культурна-асветніцкім аспекце. І семінар дасць магчымасць абмяняцца новымі знаходкамі вучоным і краязнаўцам, будзе садзейнічаць распаўсюджванню ведаў пра Кіраўскі раён у цэлым і Жыліцкі палац у прыватнасці ў Беларусі.

Для правядзення такога мерапрыемства палац выкарыстоўваецца ўпершыню. І мясцовыя ўлады бачаць у гэтым добры знак.

— Гэта яшчэ адзін спосаб звярнуцца да інвестараў, падкрэсліць важнасць аб'екта для ўсёй Беларусі, — лічыць **Тацяна БЯЛЯЎСКАЯ, намеснік старшыні Кіраўскага райвыканкама па сацыяльных пытаннях.** — Спецыяльна да гэтай падзеі мы прымеркавалі падвядзенне вынікаў конкурсу сярод школьнікаў па гісторыі роднага краю. Такім чынам мы далучаем нашых дзяцей да культурных традыцый, выхоўваем любоў да прыгажага. Сімвалічна, што яны атрымалі свае граматы менавіта ад Нацыянальнай акадэміі навук.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

***Тым, каму неабыякавая гісторыя роднай краіны і хто жадае ўнесці ўклад у аднаўленне Жыліцкага палаца, прапануем скарыстацца разліковым рахункам.***

***Дабрачынны рахунак установы культуры «Жыліцкі гістарычны комплекс-музей» 3642108762277 ААТ «АСБ Беларусбанк» Ф-л №703 г. Бабруйска.***

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ

**о проведении аукциона на право заключения договора аренды земельного участка для строительства и обслуживания торгового павильона в дер. Высокое Усяжского сельсовета, для строительства и обслуживания здания станции технического обслуживания и парковки автомобилей в аг. Барсуки Жодинского сельсовета**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2 | **Дата, время и место проведения аукциона** | г. Смолевичи, ул. Советская, 125. Смолевичский райисполком, зал заседаний, 04.07.2017 г. в 15.00 |
| 3 | **Продавец и его адрес** | г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком |
| 4 | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | Лот №1 – площадь 0,0419 га, кадастровый номер 624885601501000134 в дер. Высокое, Усяжский сельсовет<br>Лот №2 – площадь 1,0414 га, кадастровый номер 624881701101000430 аг. Барсуки, Жодинский сельсовет |
| 5 | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6 | **Целевое назначение земельного участка** | Лот №1 – для строительства и обслуживания торгового павильона (1 16 03 земельный участок для размещения объектов розничной торговли)<br>Лот №2 – для строительства и обслуживания станции технического обслуживания и парковки автомобилей (1 16 04 земельный участок для размещения объектов по ремонту и обслуживанию автомобилей) |
| 7 | **Сроки аренды** | Лот №1, 2 – 99 (девяносто девять) лет |
| 8 | **Начальная стартовая цена** | Лот №1 – 4 000 рублей<br>Лот №2 – 35 000 рублей |
| 9 | **Условия аукциона** | А) продажа по цене не ниже начальной<br>Б) участниками аукциона могут быть индивидуальные предприниматели, юридические лица;<br>В) при проектировании и строительстве учесть регламент использования и застройки земельного участка, установленный градостроительным паспортом;<br>Г) получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия на инженерно-техническое обеспечение объекта строительства, разрешение Смолевичского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 2 лет; приступить к строительству объекта в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство такого объекта;<br>Д) без права предоставления рассрочки |
| 10 | **Наличие инженерной инфраструктуры** | Лот №1 – возможность подключения к газоснабжению<br>Лот №2 – возможность подключения к водоснабжению, газоснабжению, наличие асфальтированного подъезда |
| 11 | **Условия оплаты** | За безналичный расчет в течение 10 рабочих дней со дня подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 12 | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10% от начальной стартовой цены<br>на р/с 3641000000669 ЦБУ 621 филиала №616 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Борисов, код 810<br>УНП 600014139<br>(с пометкой «задаток за земельный участок») |
| 13 | **Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемым земельным участком** | Каждый четверг с 9.00 до 12.00 |

**Расходы по организации и проведению аукциона: (лот №1 – 1 707 р. 67 к. (потери сельскохозяйственного производства – 961 р. 41 к.), лот №2 – 2 578 р. 41 к. (потери сельскохозяйственного производства – 919 р. 72 к.), затраты на публикацию и размещение в сети Интернет информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.**
**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни по адресу: г. Смолевичи, ул. Советская, д. 119.**
**Окончательный срок приема заявлений – 27.07.2017 г. в 17.00.**
Контактный телефон (8-01776) 2-73-42
Для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:
- заявление на участие в аукционе;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;
- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе индивидуальные предприниматели и юридические лица, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

**Неявка участника аукциона на аукцион признается отказом в его участии.**

УНП 100003090

*Уважаемые акционеры*
**ОАО «БЕЛАВТОТЕХСЕРВИС»,**
21.06.2017 г. состоится
ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ
по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, д. 2.
Время начала собрания – 15.00. Регистрация участников собрания будет проводиться с 14.00 до 14.45 21.06.2017 г.
ПОВЕСТКА ДНЯ:
О внесении изменений и дополнений в устав ОАО «Белавтотехсервис».

Утерянные бланки страховых полисов формы 2РН серия КЕ №0092653 – 0092656 считать недействительными.
УНП 100985903

## Извещение о проведении торгов в форме конкурса на передачу в аренду охотничьих угодий фонда запаса

Городокский районный исполнительный комитет Витебской области по поручению Витебского областного исполнительного комитета 7 июля 2017 г. в 14.00 в здании Городокского райисполкома, расположенного по адресу: г. Городок, ул. Пролетарская, 2 (малый зал, каб. 110), проводит торги в форме конкурса по предоставлению в аренду охотничьих угодий фонда запаса со сроком аренды не менее 10 лет.

На торги выставляются охотничьи угодья общей площадью 13,1 тыс. га, в том числе: лесных – 6,4 тыс. га, полевых – 5,9 тыс. га, водно-болотных – 0,8 тыс. га в следующих границах:

северная: от северо-западной кромки квартала 4 Городокского лесничества ГЛХУ «Городокский лесхоз» на северо-восток через оз. Черново на д. Корсаки, далее по грунтовой дороге на север до д. Гаврюши, далее на восток по грунтовой дороге до д. Якушенки, далее по грунтовой дороге на север на д. Малашенки, включая квартал 246 Городокского лесничества ГЛХУ «Городокский лесхоз», далее на юг, включая кварталы 247 и 241 Городокского лесничества ГЛХУ «Городокский лесхоз», далее на восток через железную дорогу Городок-Езерище, включая квартал 265 Городокского лесничества ГЛХУ «Городокский лесхоз»; далее по северным границам ОАО «Городокский льнозавод» (отделение «Вархи»), далее через автомобильную дорогу М8 граница Российской Федерации (Езерище) – Витебск – Гомель – граница Украины (Новая Гута), включая часть квартала 89 и квартал 90 Вышедское лесничества ГЛХУ «Городокский лесхоз»;

восточная: от квартала 90 Вышедского лесничества ГЛХУ «Городокский лесхоз» на юг по грунтовым дорогам мимо д. Полуяново, включая кварталы 105, 121, 131 Вышедского лесничества и кварталы 24, 27 Смоловского лесничества ГЛХУ «Городокский лесхоз» до пересечения с автомобильной дорогой Городок-Стодолище и по ней через д. Новая, д. Нов. Болецк до д. Хомяково;

южная: от д. Хомяково по границе запретной для охоты зоны вокруг г. Городок до д. Малое Кошо, далее по южному берегу оз. Кошо до северо- западного угла квартала 80 Городокского лесничества ГЛХУ «Городокский лесхоз»;

западная: от северо-западного угла квартала 80 Городокского лесничества ГЛХУ «Городокский лесхоз» через оз. Кошо до д. Севастеенки, далее на север по западным кромкам кварталов 62, 48, 27, 7, 4 Городокского лесничества ГЛХУ «Городокский лесхоз»до оз. Черново.

Сумма ежегодной арендной платы за предоставляемые в аренду охотничьи угодья – 1114,35 (одна тысяча сто четырнадцать рублей тридцать пять копеек).

Претенденты на участие в конкурсе с объектом конкурса знакомятся самостоятельно.

Условия конкурса на право заключения договора аренды охотничьих угодий:

1. лучшие предложения по эффективности использования охотничьих угодий, изложенные в обосновании необходимости приобретения и намерений по дальнейшему их использованию;

2. наличие у юридического лица опыта работы в сфере охотничьей деятельности не менее 10 лет на территории Республики Беларусь (подтверждается документально), наличие квалифицированных кадров с профильным образованием;

3. обеспечение наличия штата егерской службы в соответствии с действующим законодательством на протяжении всего срока аренды.

Для участия в конкурсе в срок по 4 июля 2017 г. до 17.00 необходимо предоставить комиссии по организации и проведению торгов, по адресу: г. Городок, ул. Пролетарская, 2, каб. 205 (с 8.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00 по рабочим дням понедельник – пятница), следующие документы:

1. заявление с указанием сведений об охотничьих угодьях, которые желает получить в аренду по результатам торгов юридическое лицо;

2. биолого-экономическое обоснование на испрашиваемые в аренду охотничьи угодья, разработанное в соответствии с требованиями законодательства;

3. предложения в письменной форме о выполнении условий конкурса, запечатанные в отдельном конверте;

4. копия платежного поручения, квитанции или иного документа, подтверждающего внесение суммы задатка на расчетный счет ГУ Министерства финансов Республики Беларусь по Витебской области №3600316007106 в филиале №200 Витебского облуправления ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 795, УНП 300594330, код платежа в бюджет 04002;

5. доверенность представителя участника конкурса и копия документа, подтверждающего его личность, в случае если заявление подписывается не руководителем участника конкурса, либо копия документа, подтверждающего полномочия руководителя участника конкурса.

Задаток вносится в размере 20 (двадцати) процентов суммы ежегодной арендной платы 222,87 (двести двадцать два рубля восемьдесят семь копеек).

Срок внесения задатка – при подаче документов.

Порядок внесения задатка – единовременно.

Кроме этого, участник, выигравший торги, в течение 5 дней с момента подписания протокола проведения торгов возмещает затраты на организацию и проведение торгов. Сумма затрат и порядок их возмещения доводится до сведения участников торгов до начала их проведения в день проведения торгов.

Договор с победителем конкурса заключается Витебским областным исполнительным комитетом в сроки, установленные законодательством. Контактные телефоны: (802139) 43105, (802139) 41032

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

**по продаже земельного участка по ул. Тетки в собственность в г. Гродно 29 июня 2017 года**

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Стоимость затрат на изготовление документации, (с учетом деноминации), руб. | Начальная цена продажи, (с учетом деноминации), руб. | Сумма задатка (с учетом деноминации), руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок У-3*,** | В районе дома №29 по ул. Тетки | 0,1028 | 440100000002009035 | 2 924,56 | 52 070,60 | 10 000 |

*Инженерные коммуникации на участке отсутствуют.
** Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земельного участка в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения. На участке находятся хозяйственные постройки, которые подлежат сносу.
Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства одноквартирного жилого дома.
Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».
Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:
внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие земельных участков (проведение строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 08.02.2016 № 49 «О некоторых вопросах возмещения затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».
**Аукцион состоится 29 июня 2017 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**
Для участия в аукционе необходимо: внести задаток не позднее **23 июня 2017 года** в размере, указанном в графе 8, перечисляемый на расчетный счет №3012000041810 в филиале №400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 752, УНП 590727594, получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению;
представить в ГП «Гродненский центр недвижимости» следующие документы;
заявление на участие в аукционе установленной формы;
документ, подтверждающий внесение суммы задатка;
подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;
дополнительно представляются:
гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.
При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.
**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, каб. 57 с 5 июня по 23 июня 2017 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**
Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.
Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан;
внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.
После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.
Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.
При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.
Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.
**Контактные телефоны: + 375 (152) 72 05 46, 72 05 37, официальный сайт организатора торгов www.grodno.gov.by**

## БЕЛАРУЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**сообщает о проведении 5 июля 2017 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства одноквартирного жилого дома в Беларучском сельисполкоме Логойского района**

| Номер лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена, бел. руб. | Расходы по подготовке зем. документации | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Аукцион по продаже земельных участков гражданам в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | | | | | | |
| 1 | Минская область, Логойский район, Беларучский с/с, д. Вяча, ул. Центральная, д. 8А, земельный участок с кадастровым номером 623280402101000184, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (ПОВТОРНО) | 0,1296 | Возможность подключения к электроснабжению, подъезд с грунтовой дороги | 9 000 | *публикация в газете +1 755,78 бел. руб.* | 900 |
| 2 | Минская область, Логойский район, Беларучский с/с, д. Мочаны, ул. Центральная, д. 17А, земельный участок с кадастровым номером 623280406101000424, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,1494 | Возможность подключения к электроснабжению, подъезд с грунтовой дороги | 11 500 | *публикация в газете +1 482,86 бел. руб.* | 1 150 |
| 3 | Минская область, Логойский район, Беларучский с/с, д. Мочаны, ул. Дачная, д. 2А, земельного участка с кадастровым номером 6232804061000426, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (ПОВТОРНО) | 0,1083 | Возможность подключения к электроснабжению, подъезд с грунтовой дороги | 9 000 | *публикация в газете +1 530,77 бел. руб.* | 900 |

Задаток (10% от начальной цены) перечисляется на расчетный счет №3600619011127 в ЦБУ №611 филиала №500 – Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 4901, УНН 600181549, получатель – Беларучский сельский исполнительный комитет.
Аукцион состоится 5 июля 2017 года в 10.00 по адресу: Минская область, Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17. Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00 по адресу: Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17. Последний день приема заявлений 29 июня 2017 года до 17.00. Контактные телефоны: (801774) 28636, 28945, 28935.

■ «Звязда» даследуе праблему

# Як спыніць ВІЧ-інфекцыю,

## або Дайце залежнаму шпрыц



**Раней праграмы па зніжэнні шкоды ад ужывання наркотыкаў у Беларусі спансіраваліся замежным фондам, а ў найбліжэйшыя гады наша краіна павінна перайсці на ўласнае фінансаванне. Калі страціць ужо створаную сістэму, складаней будзе трымаць сітуацыю з ВІЧ пад кантролем. Так было ў Румыніі: з рэзкім сыходам Глабальнага фонду для барацьбы са СНІДам, туберкулёзам і малярыяй сталі адзначаць рост колькасці ВІЧ-інфіцыраваных.**

### Калі «стоп» не спрацоўвае...

Як паказваюць даследаванні, падобныя праграмы дазваляюць прадухіліць у Беларусі да 35 працэнтаў выпадкаў ВІЧ-інфекцыі і гепатыту С у год.

Сёння ў нашай краіне амаль кожны чацвёрты нарказалежны жыве з ВІЧ. Як правіла, у такіх людзей зніжаны ўзровень інстынкту самазахавання. Для залежнага на першым месцы ўжыванне. Некалькі чалавек могуць калоцца адным шпрыцом, «стоп» не спрацоўвае, нават калі ў кампаніі ёсць чалавек з ВІЧ-інфекцыяй. Многія не высвятляюць, ці атрымалі яны небяспечную інфекцыю. Хтосьці баіцца даведацца пра жахлівую праўду, а іншыя кажуць: «І так памру, што ад СНІДу, што ад наркотыкаў».

Важна выйсці на гэтых людзей. Калі чалавек своечасова пачне атрымліваць лекі, у яго будзе менш праблем. Акрамя таго, у крыві тых, хто лечыцца, зніжаецца вірусная нагрузка, і пры палавым кантакце менш шанцаў, што яны перададуць ВІЧ іншым.

Беларусь пераняла вопыт у замежных краін, дзе лічыцца, што праграмы па зніжэнні шкоды заўсёды лепш рэалізоўваць недзяржаўным арганізацыям. Усё ж спажыўцы наркотыкаў — група цяжкадаступная, закрытая, для іх важна атрымліваць дапамогу ананімна, бясплатна.

— Гэта забароненая тэма ў соцыуме. Уявіце: мама ў сям'і абмяркоўвае, якім шпрыцом калецца сын. Бацькі выкідаюць іх з кішэняў, тым самым ставяць дзяцей пад небяспеку. Калі ў наркамана не будзе свайго стэрыльнага шпрыца, ён можа скарыстацца тым, што трапіцца пад руку. Апошнім часам сітуацыя ўскладнілася, бо з'явіліся наркотыкі, якія трэба калоць часцей. Калі раней залежнаму дастаткова было аднаго ўколу ў дзень, зараз за дзень ці ноч ён робіць іх дзесяць, — заўважае **кансультант па пытаннях ВІЧ-інфекцыі і наркаманіі Вячаслаў САМАРЫН.**

Грамадскай арганізацыяй «Пазітыўны рух», у якой ён працуе, створаны цэнтр прафілактыкі ВІЧ-інфекцыі. Сюды залежныя людзі могуць прыйсці, каб абмяняць выкарыстаныя шпрыцы на стэрыльныя. Тут жа ім выдаюцца прэзерватывы. Уласна, усе гэтыя бясплатныя раздачы — проста добрая нагода завабіць чалавека ў цэнтр. Часам за чаем і простай размовай людзі разумеюць, што нарэшце трапілі туды, дзе іх не асуджаюць і дзе можна атрымаць дапамогу. «Мы павінны працаваць так, каб чалавек адчуў: што б зараз з ім ні адбывалася, у будучым нешта можа памяняцца. Урач хай кажа хвораму: «Ты папраўішся».Так і тут важна даваць надзею, — расказвае Вячаслаў. — Часта, перш чым наркаспажывец выспее да візіту да нарколага, можа прайсці гадоў пяць. Напачатку ж у яго няма праблем: ёсць грошы, здароўе, сябры, работа, блізкія яшчэ не ведаюць — нічога не разбурана, але калі ў гэты час ён прыйдзе да нас, то мы папярэдзім яго аб небяспецы. Наша задача навучыць чалавека, нават калі ён ужывае наркотыкі, клапаціцца пра здароўе: сваё і тых, хто побач».

Усім прапануецца ананімна прайсці тэст на ВІЧ, ён займае ўсяго хвілін 10. Калі чалавек хоча жыць у чысціні, яго перанакіруюць у рэабілітацыйны цэнтр, альбо на групу, ці да псіхолага. Тут працуе юрыст. Сацыяльны работнік дапаможа з працаўладкаваннем, аднаўленнем дакументаў. І ўсё на ананімнай аснове, не трэба ніякіх даведак ці пашпартоў. Акрамя таго, у цэнтра ёсць аўтобусы, якія выязджаюць туды, дзе тэарэтычна могуць быць наркаспажыўцы. У выніку яны знаходзяць тых людзей, якія ніколі не пайшлі б у медустанову і не здалі б тэст на ВІЧ. А яшчэ ў арганізацыі працуюць людзі, якія гатовы падзяліцца сваім вопытам ужывання наркотыкаў і выхаду ў рэмісію. Замацаваны за цэнтрам і аўтрычы — актыўныя наркаспажыўцы, якія хочуць дапамагчы іншым, яны добра ведаюць асяроддзе і самі прыводзяць сюды залежных. Як вынік, каля 15 тысяч чалавек хоць раз звярнуліся па дапамогу ў мабільны ці стацыянарныя пункты (між іншым, на ўліку ў сталічным наркадыспансеры сёння толькі каля 3,5 тысячы). Дзейнічае арганізацыя з 1999 года, за гэты час многім удалося дапамагчы.

***— Атрымліваецца, залежных ці не за руку прыводзяць па дапамогу, чаму яны самі не спрабуюць вырашаць праблему?***

— Гэта цяжкае фізіялагічнае і псіхічнае захворванне. Становішча пагаршаецца тым, што грамадства адносіцца да гэтых людзей не як да хворых, а як да злачынцаў, якія жывуць дзеля задавальнення. Калі мы адкрыем цэнтр наркалогіі і проста будзем сядзець чакаць, да нас ніхто не прыйдзе. Да нарколагаў у большасці выпадкаў прыходзяць па лекі, каб знізіць дозу, перайсці з аднаго на другое рэчыва, каб хоць на час адарвацца ад ін'екцыйнага ўжывання. Прычым такая дапамога не заўсёды ананімная, чалавека ставяць на ўлік, што звязана з шэрагам абмежаванняў. Часта не хапае кваліфікаванай дапамогі такім людзям. Не заўсёды ўрач можа зразумець, што з залежным адбываецца. Часта прыём заканчваецца тым, што выпісваецца рэцэпт на амбулаторнае лячэнне ды прыём таблетак. Дэтаксікацыя і зняцце ломак у Навінках — гэта адно, чалавек выходзіць з бальніцы і не ведае, што рабіць далей. Трэба ўлічваць, што гэта хранічнае захворванне, тут нельга дапамагчы разавай акцыяй. Усё далейшае жыццё неабходна ўдзяляць залежнасці час і сілы. Разбірацца ў сабе, вырашаць праблемы, выстройваць сацыяльныя адносіны.

### Не ганьба, а дапамога

— Калі адкрыецца цэнтр для эндакрыналагічных захворванняў, ніякіх пытанняў не ўзнікне, а калі цэнтр для наркаспажыўцоў — паўсюдна будуць біць у званы. Мне даводзілася апраўдвацца, што нашы кліенты — звычайныя людзі, я ніколі не бачыў агрэсіі з іх боку, што мы даўно працуем і ніколі не стваралі праблем. Што наркаманію, што ВІЧ многія падганялі пад асабістыя эмоцыі. Як быццам гэта не хвароба, а асабістая характарыстыка чалавека. І ВІЧ, і наркотыкі — гэта праблема, і мы павінны думаць, як дапамагчы людзям, а не як зняважыць і адхіліцца ад іх.

***— Калі чалавек з ВІЧ своечасова не звярнуўся па дапамогу, што яго чакае?***

— Рана ці позна — смерць. Тэст — не адпраўны пункт. Можа, чалавек ужо даўно хварэе. Хітрасць віч-інфекцыі ў тым, што нічога не баліць: навошта нешта рабіць, калі са мной усё нармальна. Таблеткі трэба прымаць, каб і заўтра адчуваць сябе добра. Калі ўпусціць той момант, з якога неабходна пачаць лячэнне, гэта прыводзіць да захворванняў, што вельмі цяжка лечацца. Бывае, да нас прыходзяць людзі ў найцяжэйшым стане: сепсіс, пнеўманія, высокая тэмпература. Калі бачым, што чалавеку дрэнна, звязваемся з урачом-інфекцыяністам, які працуе ў гарадской службе на Крапоткіна. Такіх людзей ставяць на ногі, і мы пачынаем працаваць з імі, бо ад ужывання наркотыкаў стан пагаршаецца. Ёсць прыклады людзей з ВІЧ, якіх выцягнулі са складанай сітуацыі, сёння яны не ўжываюць наркотыкі і адчуваюць сябе добра.

***— Больш жорсткія правілы, звязаныя з наркотыкамі, паўплывалі на прафілактыку?***

— Менавіта для нашай работы гэта дадатковыя складанасці. Калі наркаман разумее, што яго за нейкую колькасць шпрыцоў могуць пасадзіць, ён не прынясе іх. Калі яго ў стане пасля ўжывання наркотыкаў могуць аштрафаваць, ён не прыйдзе ў цэнтр. Таму мы мяняем стратэгію, самі носім ім шпрыцы на абмен. Маё меркаванне: трэба менш прэсаваць тых, хто ўжывае наркотыкі. Гэта ж хворыя людзі. Галоўная змагацца з прадаўцамі. Чаму наркотык можна дастаць? Напрыклад, у замежжы ёсць спецыяльныя пакоі для залежных, дзе яны ўжываюць наркотык, але там жа яны могуць атрымаць і дапамогу.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
*dziadziula@zviazda.by*

**Старшыня БГА «Пазітыўны рух» Ірына СТАТКЕВІЧ:**

— Узровень распаўсюджання ВІЧ-інфекцыі сярод наркаспажыўцоў у Беларусі — 25 працэнтаў; для прыкладу, у Чэхіі ён усяго — 0,8 працэнта. Проста там раней пачалі працаваць па зніжэнні шкоды. А мы спазніліся. Калі ў нас развешвалі плакацікі «Чума XXI стагоддзя», трэба было працаваць з людзьмі. Апошнім часам колькасць выяўленых ВІЧ сярод наркаспажыўцоў падае. Мы лічым, што ў тым ліку паўплывала і наша дзейнасць. Нам удалося павялічыць ахоп людзей, калі мы крытычна паглядзелі на сваю работу: памянялі месца стацыянарнага пункта — пераехалі ў Фрунзенскі раён, дзе пражывае шмат наркаспажыўцоў. Сумесна з Гарадскім цэнтрам гігіены і эпідэміялогіі паглядзелі, дзе мэтазгодна стаяць нашым аўтобусам.

Зараз мы атрымліваем замежную, міжнародную тэхнічную дапамогу. Ідэальна, калі з сыходам Глабальнага фонду гэта фінансаванне проста заменіцца, напрыклад, дзяржаўным. Было б добра, каб існаваў механізм сацыяльнага заказу, субсідзіраванне грамадскіх арганізацый. Казахстан, напрыклад, спрабаваў такія паслугі аказваць на базе паліклінік, але такі вопыт аказаўся не зусім удалым.

Адзін кліент нам абыходзіцца прыкладна ў 37 долараў у год. А лячэнне аднаго ВІЧ-інфіцыраванага — а яно пажыццёвае — будзе каштаваць 35 тысяч долараў. Мяркуйце самі, чаму выгадна захаваць нашы праграмы.

■ Гучная справа

# ЗАМЕСТ ДОЎГУ ЗАБРАЛІ ЖЫЦЦЁ

## У Магілёве вынеслі прысуд забойцам прадпрымальніка

**Валерый знік майскім вечарам летась. Вырашыў пераначаваць у гаражы, дзе яны з сябрам займаліся аўтасэрвісам. Дом, у якім ён жыў разам з жонкай, знаходзіўся непадалёк. У іх сям'і якраз нарадзілася дзіця, а прадпрымальніку трэба было выспацца. Тым больш што гараж па знешнім выглядзе больш нагадвае камфартабельны катэдж, на другім паверсе якога былі пакоі, трэнажорная зала.**

Калі на наступны дзень муж не вярнуўся дахаты, жонка забіла трывогу. Хутка высветлілася, што разам з чалавекам знікла частка канапы з гаража і некаторыя яго асабістыя рэчы. Потым спаленыя рэшткі той самай канапы праваахоўнікі знайшлі ў лясным масіве Магілёва. А хутка стала вядома, што забойства здзейснілі яго непасрэдныя таварышы па бізнесе 40-гадовы Яўген і 48-гадовы Максім. Усё адбылося 20 мая, а 31-га Максіма затрымалі па падазрэнні ў забойстве. Падчас вобыску ў яго былі канфіскаваны некаторыя рэчы, якія мелі дачыненне да злачынства, у тым ліку наручнікі. На іх потым крыміналісты знойдуць сляды геному забітага. Падазраваны зразумеў, што труп будзе знойдзены, і напісаў яўку з павіннай. Потым узялі і яго таварыша.

— Яўген быў уладальнікам рознага бізнесу, — расказвае падрабязнасці гучнай справы **намеснік Магілёўскага транспартнага пракурора Рэнат МАЗОЛЬ.** — Пэўны час займаўся таксі і выдзеліў аднаго з работнікаў — Валерыя. Яны пачалі сумесна пераганяць аўтамабілі, потым адкрылі аўтасэрвіс. Дом, у якім жыла сям'я Валерыя, па словах абвінавачанага, таксама быў іх сумеснай маёмасцю, але дакументальна аформлены на пацярпелага. Яны быццам бы купілі яго ў складчыну. Неўзабаве ў іх пайшлі рознагалоссі ў бізнесе. І Валерый пачаў прэтэндаваць цалкам на ўвесь дом. Як потым прызнаўся суду Яўген, у яго была думка звярнуцца ў суд, каб падзяліць маёмасць. Але нешта гэтаму перашкодзіла. Замест гэтага ён паклікаў таварыша і ўзяў «для размовы» драўляную біту і нейкі металічны прадмет. А яшчэ яны прыхапілі наручнікі, каб ахвяра зразумела, што ўсё вельмі сур'ёзна.

— Што адбывалася далей — поўная цемра, — працягвае Рэнат Мазоль. — Яны тысячу разоў мянялі паказанні, але дакладна вядома, што забойцы нанеслі пацярпеламу не менш за два ўдары па галаве і адзін у вобласць грудзей. Потым накінулі пояс ад халата і — задушылі.

Каб схаваць наступствы «крывавай размовы», таварышы спешна замятаюць сляды. Кроў замываюць, а труп і астатнія рэчы, якія сведчаць аб забойстве — частку канапы, адзенне, — вывозяць на машыне падалей ад месца падзей. Канапу спальваюць у лесе, айфон разбіваюць і кідаюць у вадаём. Застаецца толькі надзейна схаваць труп. І Максім бярэцца зрабіць гэта ў гаражы аднаго з магілёўскіх прадпрыемстваў па месцы сваёй працы. Цела забітага ён проста закатвае ў бетон. Момант, калі машына заязджае ў гараж, а потым выязджае, зафіксавалі размешчаныя на тэрыторыі камеры відэаназірання. Пахаваўшы труп, Максім едзе спальваць знятае з забітага адзенне.

— Зламыснікі рабілі ўсё, каб заблытаць сляды, — расказвае Рэнат Мазоль. — Нават калі вывозілі труп, карысталіся рацыяй. Яны ж пэўны час працавалі таксістамі. Той, хто ехаў першым, папярэджваў аб наяўнасці ДАІ і іншых аўтамабіляў.

Машыну, на якой вывозілі цела забітага, Максім потым прадаў знаёмаму. Там на некаторых агрэгатах таксама былі знойдзены сляды крыві. Біту і арматуру праваахоўнікі так і не знайшлі. Забойцы сказалі, што выкінулі ў смеццевы бак. А вось ювелірныя вырабы выкінуць рука не паднялася. Спачатку забралі ланцужок з крыжыкам, які ўпаў з шыі Валерыя, калі з яго здзекаваліся. Суд гэты факт кваліфікаваў абвінавачаным як разбой. Астатнія каштоўнасці, гаворыцца ў справе, Максім зняў ужо з забітага, калі хаваў яго ў сваім гаражы. Частку з іх аддаў суседу, а другую закапаў. Хоць першапачаткова сцвярджаў, што ўсё выкінуў у Дняпро.

— Яўген усё браў на сябе, бо забойства групай асоб больш сурова караецца, — расказвае дзяржабвінаваўца. — Максім казаў, што ніякага актыўнага ўдзелу не прымаў, толькі вывозіў труп. Але ёсць факты, якія бясспрэчна даказваюць іх сумеснае дачыненне да забойства. Быў момант, калі Максім спрабаваў знішчыць яўку з павінай. Следчы перад перадачай справы ў суд даў яму з ёй азнаёміцца. На нейкі час мужчына застаўся адзін. І гэтага яму хапіла, каб вырваць дакумент і схаваць. Гэта толькі пагоршыла яго становішча, бо да ўсяго астатняга яшчэ прыбавілася крымінальная адказнасць па артыкуле 377 — крадзеж дакумента.

Калі зачытвалі прысуд, у зале, дзе не было ніводнага вольнага месца, стаяла мёртвая цішыня. Жонка забітага прасіла, каб абвінавачаных прысудзілі да выключнай меры пакарання. Але суд даў кожнаму з іх па 22 гады пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці. У Яўгена хапіла мужнасці папрасіць у жонкі забітага прабачэння. А вось Максім нават не прызнаў сваёй віны.

Па этычных меркаваннях імёны герояў крымінальнай гісторыі зменены.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# НЯСУМНЫЯ КАНІКУЛЫ

## Аздараўленчы лагер — выдатная школа сацыяльнай практыкі


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**«Лета — час адкрыццяў» — менавіта пад такім дэвізам у Год навукі пройдзе летняя аздараўленчая кампанія, якая стартуе ў нашай краіне ў найбліжэйшыя дні. Плануецца, што ў летні перыяд умацуюць сваё здароўе больш як 357 тысяч дзяцей, у тым ліку 12,6 тысячы дзяцей-сірот і 3,9 тысячы дзяцей-інвалідаў.**

Сёлета будуць функцыянаваць 6072 дзіцячыя аздараўленчыя лагеры (1553 — з кругласутачным знаходжаннем дзяцей, у тым ліку 146 стацыянарных, і 4519 лагераў — з дзённым).

На правядзенне дзіцячай летняй аздараўленчай кампаніі 2017 года са сродкаў рэспубліканскага бюджэту будзе накіравана BYN39,1 млн. Сярэдні кошт пуцёўкі ў аздараўленчы лагер з кругласутачным знаходжаннем на 18 дзён складзе BYN410, з дзённым знаходжаннем — BYN90. Частка выдаткаў на набыццё пуцёвак будзе ажыццяўляцца за кошт сродкаў прадпрыемстваў, прафсаюзных арганізацый, а таксама мясцовых бюджэтаў.

### ПРОФІЛІ — НА ЛЮБЫ ГУСТ

Не сакрэт, што найбольшую колькасць спрэчак выклікае функцыянаванне аздараўленчых лагераў пры школах. Ці можа дзіця паўнавартасна адпачываць у тых жа сценах, у якіх праявяло ўвесь навучальны год пад наглядам сваіх школьных педагогаў? Тым больш што час ад часу і настаўнікі, і бацькі выказваюць незадаволенасць прымусовым напаўненнем школьнага лагера.

— Аздараўленне — гэта права, а не абавязак: супрацьь жадання наведваць школьныя летнікі ніхто не прымушае, а калі такое ўсё ж адбываецца, мы заўсёды ўмешваемся і рэагуем на падобныя сігналы, — запэўнівае **начальнік упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі Марыя САРОТНІК.** — Планавыя аб'ёмы на аздараўленне фарміраваліся толькі пад рэальную патрэбу. Аднак бацькам усё ж такі варта задумацца, чым будуць занятыя іх дзеці, калі тыя застаюцца ў горадзе. Між іншым, адпачынак у школьным лагеры — самы танны і самы даступны, у тым ліку і для малазабяспечаных сем'яў.

Па інфармацыі Міністэрства адукацыі, сёлета ва ўсіх рэгіёнах будуць працаваць профільныя лагеры самай рознай накіраванасці: экалагічныя, біялагічныя, тэхнічныя, гісторыка-археалагічныя, сацыяльна-педагагічныя, матэматычныя, грамадска-гуманітарныя, лінгвістычныя, лагеры для актывістаў грамадскіх арганізацый, для выхаванцаў з матываванымі і адоранымі дзецьмі, мастацкія, харэаграфічныя, ваенна-патрыятычныя, абаронна-спартыўныя, прававыя, прафарыентацыйныя і іншыя.

Для прыкладу, Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства арганізуе змены для юных біёлагаў, юных лесаводаў, юных краязнаўцаў і экскурсаводаў. Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі ініцыюе профільную змену на базе Нацыянальнага дзіцячага цэнтра «Зубраня» — для актывістаў дзіцячых і маладзёжных аб'яднанняў «Лідар-2017». У Лідскім раёне пройдзе рэспубліканская профільная змена для членаў клубаў інтэлектуальных гульняў. На профільныя змены запрашае школьнікаў, якія захапляюцца робататэхнікай, Рэспубліканскі цэнтр інавацыйнай і тэхнічнай творчасці. Актыўна будзе развівацца таксама і валанцёрска-педагагічны профіль.

Папулярнасцю карыстаюцца палатачныя лагеры, якія ствараюцца па прынцыпе «летніку ў летніку» — на базе стацыянарных лагераў з добра развітой інфраструктурай. Яны працуюць, як правіла, у 9-дзённым рэжыме. Так, на тэрыторыі Нацыянальнага дзіцячага адукацыйна-аздараўленчага цэнтра «Зубраня» дзейнічае палатачны лагер пад назвай «Ружа вятроў». Ён ахоплівае 8 профіляў (ад тэхнічнага да фізкультурна-спартыўнага і грамадска-гуманітарнага). Кожную змену ў ім пражываюць 5 атрадаў па 24 чалавекі. Але дзеці не спяць у спальніках на зямлі, як хтосьці падумаў. У палатках з драўлянымі насціламі ўстаноўлены ложкі, ёсць санітарныя блокі. Плюс выхаванцы карыстаюцца ўсёй інфраструктурай цэнтра.

### ПРАЦАВАЦЬ І АДПАЧЫВАЦЬ

У зоне асаблівай увагі педагогаў падчас летніх канікул традыцыйна знаходзяцца дзеці і падлеткі з неўладкаваных сем'яў і дзеці, якія стаяць на розных відах уліку. Яны будуць працаваць у складзе студэнцкіх маладзёжных атрадаў (узроставы цэнз для іх удзельнікаў зніжаны да 14 гадоў), накіроўвацца ў лагеры працы і адпачынку ці ваенна-патрыятычныя лагеры.

Усяго гэтым летам у 884 лагерах працы і адпачынку плануецца аздаравіць 15 тысяч падлеткаў. Мінулым летам заробак там даходзіў да BYN250. У Рэспубліканскім цэнтры па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні абяцаюць: заработная плата падлеткаў сёлета ніжэйшай не стане. Усё будзе залежаць ад віду работ, прадукцыйнасці працы і працягласці змены...

Пералік аб'ектаў, дзе будуць працаваць падлеткі, фарміруецца на рэгіянальным узроўні, а патрэбы пралічваюцца зыходзячы са спецыфікі рэгіёна: калі рэгіён сельскагаспадарчы, то асноўнымі аб'ектамі стануць аграпрамысловыя арганізацыі, а калі рэгіён прамысловы, то, безумоўна, для старшых школьнікаў знойдзецца некваліфікаваная праца на прамысловых прадпрыемствах ці ў гандлёвых аб'ектах.

### З БАЦЬКАМІ — НА СУВЯЗІ

Апошні трэнд у аздараўленчай кампаніі — стварэнне адзінай камунікацыйнай прасторы выхаваўча-аздараўленчых устаноў.

— Важнае значэнне мы надаём сайтам нашых лагераў, размяшчэнню на іх карыснай для бацькоў інфармацыі як напярэдадні змены, так і падчас знаходжання дзіцяці ў летніку, — падкрэслівае Марыя Саротнік. — Важна, каб з сайта можна было даведацца, чым жывуць дзеці ў летніку, што там адбываецца на працягу змены. Выдатна, калі можна будзе задаць пытанне педагогу ці псіхолагу. Пакуль што найбольш напоўнены актуальнай інфармацыяй сайт Нацыянальнага дзіцячага адукацыйна-аздараўленчага цэнтра «Зубраня», дзе ёсць віртуальная кніга дзіцячых дасягненняў, парады для педагогаў і бацькоў, працуе анлайн-пляцоўка...

**У 884 лагерах працы і адпачынку плануецца аздаравіць 15 тысяч падлеткаў.**

Увогуле, ёсць меркаванне, што прынцыпы дзейнасці псіхалагічнай службы падчас аздараўленчай кампаніі трэба змяняць, у прыватнасці працаваць на апярэджанне, праводзіць своечасовую псіхалагічную дыягностыку. Калі ў штаце лагера няма свайго псіхолага, для гэтых мэт будуць прыцягвацца адпаведныя спецыялісты з устаноў сярэдняй адукацыі і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

Натуральна, што бацькі дзяцей, якія ўпершыню едуць у лагер, хвалююцца. Псіхолагі рэкамендуюць ім не спяшацца з візітам: дзіцяці патрабуюцца 2—3 дні на адаптацыю, а прыезд дарослых у гэты час можа абвастрыць у ім жаданне з'ехаць дадому. Аптымальна — прытрымлівацца ўстаноўленых бацькоўскіх дзён. Разам з тым дзіцячы аздараўленчы лагер — гэта выдатная школа сацыяльнай практыкі, выстройвання стасункаў у соцыуме. І ўсё, чаму навучалі дзіця ў школе і ў сям'і, можа яму тут спатрэбіцца...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
nikalaeva@zviazda.by

### Будзь у курсе!

**Дазваляецца перадаваць дзецям у лагер:**

**цукеркі, зефір, мармелад, шакалад, кандытарскія вырабы без крэму,**

**сушкі, булачкі, кексы, арэхі (вычышчаныя), сухафрукты,**

**сокі, свежую садавіну ў невялікай колькасці (не больш за 0,5 кг).**

**Забараняецца перадаваць:**

**прадукты, якія хутка псуюцца (мясныя, малочныя, рыбныя, кандытарскія вырабы з крэмам, агародніну, ягады і г. д.), а таксама кансерваваныя прадукты дамашняга прыгатавання**

---

■ Блізкая гісторыя

# РЭКАНСТРУКЦЫЯ З ПРАФАРЫЕНТАЦЫЯЙ

**Студэнты і выкладчыкі гістарычнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны прапанавалі адчуць гісторыю сярэднявечча на смак і водар.**

Удзельнікам музея жывой гісторыі мог стаць кожны, хто выпадкова ці наўмысна зазірнуў у студэнцкі дворык ВНУ. На дзень тут абасноўваўся амаль сапраўдны паходны лагер. Ну быццам бы тых часоў, калі адбылася Грунвальдская бітва, — а гэта больш за 600 гадоў таму.

Кальчугі і шлемы надзелі не толькі студэнты, але і прадстаўнікі розных прафесій. Усе яны займаюцца ў клубах гістарычнай рэканструкцыі Беларусі, Расіі і Украіны. Кожнаму знайшлося месца і асаблівая роля ў лагеры. Народ ішоў на пах, і смажанае на вогнішчы мяса імгненна станавілася здабыткам гледачоў. Як не пакаштаваць і палюбаваць, тым больш што зроблена яна па рэцэпце XII стагоддзя, гаворыць **шэф-кухар лагера Марына ДРАБЫШЭЎСКАЯ:**

— Мы прыгатавалі суп для хворага чалавека — у ім усё пераціёрта. Гэта страва, якую ўвогуле не трэба жаваць, але пры гэтым пажыўная. Усе рэцэпты кухні сярэднявечча простыя. У іх уваходзіць усё тое, што не сапсуецца і можна ўзяць з сабой: мука, зерне, агародніна і садавіна. Дарэчы, бульбы і таматаў нашы продкі яшчэ не ведалі ў той час. Да таго ж стравы былі маласольнымі, бо соль была вельмі дарагой. Яе замянялі спецыі — іх клалі ў ежу многа. Часам з хлеба была і талерка, і ў ёй падавалася страва. Увогуле ж мясарубак, блэндараў і мультыварак не было, таму ўсё рабілася з дапамогай дошкі, нажа і рук.

Жыхароў Гомеля частавалі далікатэсамі, якіх у меню лагера аказалася не так і мала: мяса на ражне, аржаны хлеб з печы, яблыкі ў кляры, пірагі з тварагом і мёдам... Тым часам у палявой гамарні збройнік і малатабоец кавалі меч, а побач лучнік праводзіў майстар-клас. Завяршылася свята рыцарскім турнірам і дэманстрацыяй сярэднявечных рамёстваў. **Старшы выкладчык кафедры ўсеагульнай гісторыі**





**Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны Антон ШЫЛЯЕЎ** гаворыць, што дух сярэднявечча і цікаўнасць да сваёй гісторыі ідуць побач і адно аднаму шчыра дапамагаюць:

— Да нас завітала многа школьнікаў. Ім усё вельмі цікава, і мы спадзяёмся, што яны потым прыйдуць да нас вучыцца.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** iost@zviazda.by

# Пчолы адпачываюць...


Пладатворчасць.


На селекцыі грушы старшыя навуковыя супрацоўнікі аддзела селекцыі пладовых культур Юлія КАНДРАЦЁНАК і Вольга ЯКІМОВІЧ.

## Як у Бернарда Шоу

— Штогод мы можам праводзіць 40—50 камбінацый скрыжоўванняў, апыляем дзясяткі тысяч кветак, але толькі два працэнты ідзе на вынік, астатняе на розных этапах бракуецца. Нават сотні камбінацый скрыжоўванняў не заўсёды даюць сорт. Часта мы адбіраем новыя зыходныя формы, якія будуць прамежкавымі для сорту будучага, — расказвае **загадчык аддзела селекцыі пладовых культур, прафесар Зоя КАЗЛОЎСКАЯ**. — Сёння ўсім хочацца, каб дрэва давала смачныя плады, і каб яны былі яшчэ і прыгожыя. Акрамя таго, для садавода трэба, каб яно было здаровае, устойлівае да хвароб, маразоў, вясенніх халадавых стрэсаў. Сумясціць усё ў адным даволі складана. Як у Бернарда Шоу, памятаеце: « Я такая прыгожая, а вы такі разумны, якія цудоўныя ў нас будуць дзеці». А мужчына пытаецца: «А што, калі знешнасцю яны будуць падобныя на мяне, а розумам — на вас?» Так і ў нас: не заўсёды перадаюцца ў спадчыну тыя якасці, як хочацца. Таму стараемся атрымаць як мага больш сеянцаў, каб было з чаго выбіраць. Напрыклад, калі пэўныя дрэвы даюць не вельмі смачныя і не вельмі буйныя яблыкі, але валодаюць устойлівасцю да шкоднікаў і хвароб, мы праводзім іх скрыжоўванне з высакаякаснымі генатыпамі для таго, каб у будучыні атрымаць сарты і ўстойлівыя, і прыгожыя, і смачныя.


І «Звязда» сады апыляла.

На яблыні знойдзена больш за 200 узбуджальнікаў розных хвароб. У мяккія зімы яны добра перазімоўваюць. Яны самі прызвычайваюцца да асяроддзя, з'яўляюцца новыя, вельмі агрэсіўныя расы, якія шкодзяць болей, чым раней. Таму і трэба весці селекцыю з апярэджаннем, шукаць крыніцы ўстойлівасці нават у дзікіх відаў яблыні і грушы. Новыя праекты, якія цяпер распрацоўваем, накіраваны на паскарэнне селекцыйнага працэсу, паляпшэнне адбору зыходнага матэрыялу. З прымяненнем новых метадаў — штучнага клімату, штучнага заражэння, прышчэпак, паралельнага выпрабоўвання ў вытворчасці і іншых прыёмаў — удалося скараціць яго ўдвая. Але нават зараз, каб падрыхтаваць новы сорт да дзяржвыпрабавання, ідзе мінімум 15 гадоў, а пасля трэба дачакацца пладанашэння і сабраць тры таварныя ўраджаі.

## Апыленне — справа тонкая

Здаецца, няцяжка самаробнай пылілкай трапіць у рыльца песціка, але працаваць трэба вельмі хутка, таму што аб'ёмы работ, якія выпадаюць на долю вучоных, уражваюць. Звычайна пыліць яны пачынаюць, калі ўсё зацвіце, калі ж якая кветка не раскрытая, пялёсткі з яе акуратна сашчыпваюцца, каб дабрацца да сярэдзіны. Апрацаваныя галінкі ізалююцца ў марлевыя мяшэчкі, дзе і будуць выспяваць плады з будучым насеннем. Дарэчы, пылок кожнага бацькоўскага сорту збіраецца загадзя з нераскрытых бутончыкаў, а яшчэ правяраецца на прарастанне. Наогул, працаваць з грушай даволі складана: яна можа падмерзнуць, не зацвісці. Альбо бацькоўскія формы зацвітуць у розны час, і можна не паспець сабраць пылок. З 12 апыленых кветак могуць завязацца ўсяго два—чатыры плады. І нават калі сабрана насенне, гэта яшчэ шчасце атрымаць удалы экземпляр. Так, калі ў костачкавых выхад культурных сеянцаў з пладамі добрай якасці некалькі дзясяткаў працэнтаў, у яблыні — толькі 0,5 працэнта, а ў грушы і таго меней. Ды і не кожнаму даецца плодастваральная праца, некаторыя людзі гадамі гэтаму вучацца, а сарты ў іх атрымліваюцца так сабе. Тут неабходна асаблівае чуццё — без яго не падабраць удалых «жаніхоў» для апылення і не адчуць, якія з сеянцаў могуць даць добры вынік.

Раней на стварэнне новага сорту грушы траціліся дзясяткі гадоў, прычым часта распачатую працу працягвалі новыя пакаленні вучоных. Дзякуючы рабоце Марыі Мялік былі выведзены такія гібрыды і сарты, якія пачалі пладаносіць ужо на трэці-чацвёрты год (некалі такі вынік лічыўся нерэальным). Між іншым, саджанцы грушы Проста Марыя, які стварыла Марыя Рыгораўна, карыстаюцца шалёнай папулярнасцю і ў нас, і ў Расіі, і гэта пры тым, што там яны каштуюць на трэць даражэй за ўсіх астатніх. Зараз на дапамогу ёй прыходзіць новы адбор, створаны беларускімі селекцыянерамі, — Завея, ён прыстасаваны да нашых зім, халодных вёснаў, дае цудоўныя буйныя плады, якія здольны захоўвацца да лютага, гэта будзе годная замена Канферэнцыі.

— Зараз вы апылялі грушу буйнаплодная (да 600 грамаў!) сорту Дэсертная Расашанская пылком гібрыда 89-32/28, высокаўраджайнага, са смачнымі, але невялікімі пладамі (мякаць лепшая, чым у «Канферэнцыі»), асенняга тэрміну выспявання. Мы плануем атрымаць расліну з масай плоду як у «мамы», а смакам — як у «таты», — тлумачыць **старшы навуковы супрацоўнік аддзела селекцыі пладовых культур Вольга ЯКІМОВІЧ**. — Гэта толькі адна з камбінацый. Зараз задача Інстытута — стварыць як мага болей гібрыдаў, элітных формаў з познім тэрмінам выспявання, прыдатных для захоўвання, зімастойкіх і буйнаплодных, розных смакавых якасцяў (можна з масляністай мякаццю ці хрусткай, салодкія і з кіслінкай, галоўнае — смачных!). Мы бяром для гібрыдызацыі сарты, якія спалучаюць максімум карысных уласцівасцяў, і першае — гэта зімастойкасць, бо калі дрэва вымерзне, нічога з яго не атрымаем. Часам людзі бачаць плады і загараюцца жаданнем купіць пэўны сорт. Але калі нават у нейкі год дрэва і дасць добры ўраджай, на наступны яно можа не справіцца з маразамі, падмерзлае ж дрэва будзе аднаўляцца некалькі гадоў і часта ў рэшце рэшт гіне.

Сёння некаторыя садаводы любяць «перарабляць» дрэвы. Так, калі нейкі сорт грушы ці яблыні не спадабаўся, дрэва можна прышчапіць па новай. Часам аматары нават на адно дрэва прышчэпліваюць чаранкі сартоў з рознымі тэрмінамі выспявання: летнімі, асеннімі, зімнімі. Такое дрэва-сад прыемна ўразіць працяглым пладанашэннем і разнастайнасцю ўраджаю.

А вызначыцца з тым, чым менавіта абзавесціся, дапамогуць семінары-лекторыі, якія сёлета ладзіцца ў Інстытуце пладаводства ў межах Года навукі, дзе можна не толькі атрымаць парады, але і прадэгуставаць плады ўсіх пладовых і ягадных культур, што тут вырошчваюцца, і набыць чаранкі нават рэдкіх, калекцыйных сартоў.

## Іспыты для раслін

Хапае вучоным і матэматыкі: па кожнай скрыжаванай культуры падлічваецца, колькі апылена кветак, завязалася пладоў, насення, далей — колькі з яго прарасло. З кожным дрэўцам вазні не менш, чым з малымі дзеткамі. Прычым ужо з самых першых дзён раслін, якія толькі ўзышлі з насення, пачынаюцца экзамены. Маленькія сеянцы ўсяго з трыма-чатырма лістамі заражаюць адным з самых шкодных захворванняў яблынь — паршой (гэта яна дае чорныя плямы на пладах і лісці). Усё, што захварэла, адразу знішчаецца. Вучоныя ствараюць сумесь паразітаў, якая ўключае самыя злосныя, агрэсіўныя расы, каб у выніку адабраць найбольш устойлівыя расліны. Тыя, якія выстаялі, пасля правяраюць на ўстойлівасць да мучністай расы — яшчэ адной небяспечнай для яблыні хваробы. А ўжо пасля расліны чакае не менш важны экзамен — на выжыванне ва ўмовах натуральнага асяроддзя, дзе дзейнічаюць і маразы, і засухі. Але вучоным мала проста атрымаць устойлівую расліну, важна, каб яна прыносіла добрыя высакаякасныя плады. У выніку з высеяных увесну пяці тысяч семачак можна адабраць усяго 2—3 расліны, якія пакажуць сябе ў будучыні як сорт...

Мы паглядзелі «садок і школку», дзе размешчаны самыя маленькія расліны, і выправіліся на пітомнік. Уразіла, як шчыльна пасаджаны дрэўцы. Некаторыя з іх сёлета ўпершыню заквітнелі. Калі з'явяцца першыя плады, вучоныя будуць вырашаць далейшы лёс раслін. З удалых экзэмпляраў знімуць чаранкі і размножаць на клонавых падвоях, якія паскараюць пладанашэнне.

— Зараз мы скарачаем працэс селекцыі за кошт ушчыльнення пасадак і сумяшчэння розных этапаў селекцыі. Мы вырашылі скарыстацца вопытам калег з-за мяжы і дабіваемся першага пладанашэння ўжо ў пітомніку, які займае куды менш месца, чым селекцыйны сад, — расказвае **старшы навуковы супрацоўнік аддзела селекцыі пладовых культур Юлія КАНДРАЦЁНАК**. — Калі знойдзем нешта з шыкоўным смакам, але хваравітае, пакінем. Яно не стане сортам, але мы пастараемся далей скрыжаваць яго з вельмі ўстойлівым сортам. Гэтак жа і расліны з не вельмі смачнымі пладамі, але з цудоўнай зімастойкасцю і ўстойлівасцю да хвароб адназначна прыцягнем у селекцыю. Зараз вельмі шмат хвароб, і яны пастаянна мяняюцца, прычым садаводы часта неўсвядомлена гэтаму спрыяюць, калі няправільна прымяняюць хімікаты. Фактычна так запускаецца працэс штучнага адбору, мы дапамагаем застацца самым моцным, жывучым шкодным мікраарганізмам і насякомым. Якім бы добрым ні быў сорт, калі ён моцна хварэе, перад вытворцам стаіць выбар: альбо адмаўляцца ад яго, альбо ўкладаць вялікія сродкі ў абарону ад псавання. Так, многія еўрапейскія яблыкі, якія мы часта сустракаем на паліцах магазінаў, з цудоўным смакам і «мадэльнай» знешнасцю, патрабуюць каля 20 апрацовак за сезон. Улічваючы, што апрацоўваць адным і тым жа прэпаратам два разы запар на працягу сезона забаронена, уяўляеце, колькі ўсяго будзе скарыстана і колькі рэшткаў хімічных рэчываў можа застацца ў яблыку. Устойлівыя сарты патрабуюць значна менш абароны альбо могуць амаль поўнасцю адмовіцца ад яе і дазваляюць атрымліваць здаровую, экалагічна чыстую прадукцыю. А калі гаспадар сада своечасова праводзіць падкормкі, абрэзку, паліў, расліна больш моцная і менш схільная да нападзення хвароб і шкоднікаў. Так, у раслін таксама ёсць імунітэт, і ён змяняецца ў залежнасці ад таго, у якіх умовах расце дрэўца. Некалі знакаміты савецкі вучоны сказаў, што «лішкам гною нельга пакрыць недахоп ведаў». На жаль, многія нашы садаводы і аграномы прытрымліваюцца адваротнага: лічаць, што лепш паболей бухнуць угнаенняў і пестыцыдаў. Усё павінна прымяняцца з розумам, своечасова і па інструкцыі, тады будзе здаровы сад, багаты ўраджай, экалагічна чыстыя і карысны...

## Ведай нашых!

І толькі калі сеянцам вытрыманы ўсе іспыты, на вучоным савеце інстытута прымаецца рашэнне аб перадачы яго ў дзяржаўнае сортавывучэнне і яму нарэшце даецца ўласнае імя.

— Калі бачым паводзіны расліны, здольнасці, яе характар, плады, абмяркоўваем, якое імя ёй больш падыдзе. Напрыклад, у нас ёсць вішня Канфіцюр — калі вывучалі на прыгоднасць да перапрацоўкі, насупраць сорту было пазначана, што плады ідэальныя для канфіцюра. У вішні Мілавіца ягадка дэсертная, салодкая, прыгожая — ну, мілата! Нясвіжская — адзін з найлепшых беларускіх адбораў вішні, быў знойдзены ў ваколіцах Нясвіжа, вывучаны і вылучаны як новы сорт, — расказвае Юлія Георгіеўна. — Імпартазамяшчэнне пры дапамозе нашых беларускіх сартоў больш чым магчыма, асабліва па такіх традыцыйных для нас культурах, як яблыня, груша, нават вішня, чарэшня, сліва і алыча. Калі бачыш у супермаркетах прыгожыя яблыкі, найперш думаеш — «польскія», а я аднойчы падышла да такой скрыні і была ўражана — гродзенцы! Яблыкі былі калібраваныя, чысценькія, адзін у адзін. Пры вытворчасці яблыкаў у Польшчы кіруюцца прынцыпам, што на адным дрэве не павінна быць больш за 90 пладоў, толькі тады атрымаецца 99 працэнтаў таварнай прадукцыі. Не трэба гнацца за валам, за тонамі яблыкаў пасрэднай якасці — яны дрэнна прадаюцца, лепш атрымаць меней, але высакаякасных.

Галіну Маруду — суаўтара 15 беларускіх сартоў яблыні, мы заспелі ў калекцыйным яблыневым садзе, тут вялася ізаляцыя дрэў: пакуль сад не заквітнеў, трэба закрыць галінкі, выбраныя для скрыжоўвання, ад пчолак, якія могуць прынесці «незапланаваны» пылок.

Галінай Міхайлаўнай была сабрана багатая калекцыя Антонаўкі, выдзелены яе клоны, сярод якіх ёсць салодкія, белыя, ружовабокія, з гіганцкімі пладамі. Дарэчы, нядаўна прыйшоў добры водгук з ЮАР на адзін з яе сартоў — Чараўніца, які там сябе добра паказаў. Нашы сарты ўсюды дэманструюць беларускі характар — талерантнасць, устойлівасць, выжывальнасць і стабільную ўраджайнасць якасных пладоў у самых суровых умовах: ад паўднёвай Афрыкі да Казахстана і Фінляндыі; а гэтай вясной партыя нашых яблынь і груш была адпраўлена на Сахалін.

Бельгійцы зацікавіліся беларускім сортам яблыні «Дыямент». Калі Бельгія — «заканадаўца мод» у селекцыі груш і яблынь, — захацела ў сябе патэнтаваць наш Дыямент для вытворчасці, то для беларускіх вучоных гэта параўнальна амаль што з Нобелеўскай прэміяй у садаводстве.

Як бачыце, наша селекцыя развіваецца, у Беларусі ствараюцца новыя цудоўныя сарты яблынь і груш, проста дайце ім належны догляд і прытрымлівайцеся тэхналогій, прапісаных людзьмі, што іх стварылі, — і вы ніколі не застанецеся без ураджаю!

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
dziadziula@zviazda.by


Якія ж плады дадуць новыя расліны ў пітомніку?

Фота Надзеі БУЖАН.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

УНП 101165625

## ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

**Республика Беларусь, 220007, г. Минск, ул. Московская, 14**

Тел.: (+375 17) 309 15 15, (+375 29) 309 15 15, (+375 33) 309 15 15

### КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

**на 1 апреля 2017 г.**
**ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)**

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2017 год | 2016 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 33 016 | 30 964 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 60 822 | 197 858 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 55 797 | 133 040 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 286 446 | 174 232 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 555 225 | 845 648 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 407 | 455 |
| 9 | Инвестиции в зависимые юридические лица | | | - | - |
| 10 | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | | | - | - |
| 11 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 2 | 2 |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 60 650 | 56 803 |
| 13 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 2 052 | 2 510 |
| 14 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | 494 | 430 |
| 15 | Деловая репутация | | | - | - |
| 16 | Прочие активы | 1112 | | 12 161 | 20 247 |
| 17 | ИТОГО активы | 11 | | 1 067 072 | 1 462 189 |
| 18 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 19 | Средства Национального банка | 1201 | | - | 50 984 |
| 20 | Средства банков | 1202 | | 125 421 | 397 892 |
| 21 | Средства клиентов | 1203 | | 728 681 | 805 844 |
| 22 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 20 632 | 29 054 |
| 23 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 97 | 23 |
| 24 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 25 | Прочие обязательства | 1207 | | 33 346 | 29 511 |
| 26 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 908 177 | 1 313 308 |
| 27 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | | |
| 28 | Уставный фонд | 1211 | | 77 962 | 77 962 |
| 29 | Эмиссионный доход | 1212 | | 3 432 | 3 432 |
| 30 | Резервный фонд | 1213 | | 9 728 | 8 257 |
| 31 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 30 321 | 28 723 |
| 32 | Накопленная прибыль | 1215 | | 37 452 | 30 507 |
| 33 | Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации-банку | | | 158 895 | 148 881 |
| 34 | Доля неконтролирующих акционеров | | | - | - |
| 35 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 158 895 | 148 881 |
| 36 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 1 067 072 | 1 462 189 |

### КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

**на 1 апреля 2017 г.**
**ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)**

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2017 год | 2016 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 35 472 | 53 913 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 12 407 | 26 963 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 23 065 | 26 950 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 7 389 | 13 677 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 1 080 | 1 939 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 6 309 | 11 738 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 18 | 15 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 2 778 | 6 699 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | (1 170) | (3 439) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 11 651 | 22 402 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 1 334 | 2 536 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 14 541 | 14 707 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 524 | 645 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 5 618 | 6 745 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | | 1 258 | 920 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 4 360 | 5 825 |
| | Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц | | | - | - |
| | Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц | | | - | - |
| | ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | | | 4 360 | 5 825 |
| | Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации-банку | | | 4 360 | 5 825 |
| | Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке) | | | - | - |

Председатель Правления В.В. Иванов

Главный бухгалтер М.В. Дудко

Дата подписания: «17» мая 2017 г.

**Финансовая отчетность на 1 апреля 2017 г. в полном объеме размещена на сайте банка по адресу: www.vtb-bank.by**

---

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

**извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены по продаже гаража в г. Минске, ул. Горовца, 5-89**

**Лот №1**. Гараж с инв. № 500/D-28831, расположенный по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Горовца, д. 5, пом. 89. Площадь – 31,1 кв. м. Назначение: помещение транспортного назначения. Начальная цена – 8 928,00 бел. руб. Задаток – 892,00 бел. руб.

ОБРЕМЕНЕНИЕ

Арест. Постановление следователя Генеральной прокуратуры РБ от 28.12.2007 №б/н. Арест будет снят в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь после реализации Объекта с публичных торгов

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) (Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
3. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект недвижимости, обращенный в доход государства, осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 29.06.2017 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**
**Шаг аукциона – 5%**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже гаража (Лот №1), проводимом 29 июня 2017 г.
Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений и задатков – 27.06.2017 в 11.00.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта аукциона – Григорьев Александр Юрьевич, тел. 8 (044) 795-73-37.
Организатор аукциона вправе снять лот с торгов по письменному указанию подразделения Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550-09-52, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

---

Центр Промышленной Оценки

• **Организация аукционов**
• **Оценка всех видов имущества**

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Трест Белтрансстрой», г. Минск, ул. Советская, 8 |

**Предмет аукциона**

**Лот № 1**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инв. номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| **Механический склад цемента** | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 45,2 кв. м | 100/С-47322 | г. Брест, ул. Карасева, д. 100 |
| **Здание компрессорной станции** | Здание специализированное иного назначения | 62,4 кв. м | 100/С-47332 | |

**Начальная цена Лота №1 с НДС** — **27 192,00 бел. руб. (снижена на 50%)**

Сведения о земельном участке: Лот №1 расположен на земельном участке пл. 0,8420 га, предоставленном продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания производственной базы. Продавец в установленном законодательством порядке после проведения аукциона обращается за осуществлением регистрационных действий в отношении земельного участка, необходимого для обслуживания предмета аукциона. После выделения самостоятельного земельного участка для обслуживания реализованного лота между продавцом и покупателем в течение 10 (десяти) рабочих дней после получения продавцом свидетельства о государственной регистрации земельного участка должен быть заключен договор купли-продажи

**Лот №2**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инв. номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| **ФОК** | Здание специализированное физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения | 764 кв. м | 350/С-111202 | г. Гомель, ул. Демьяна Бедного, 7 |

Составные части и принадлежности: пристройка, тамбур, крыльца

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи:** | 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона |
| **Начальная цена Лота №2 с НДС** | **220 552,53 бел. руб. (снижена на 20%)** |

Сведения о земельном участке: пл. 0,4061 га. Целевое назначение: для эксплуатации и обслуживания общежития, физкультурно-оздоровительного комплекса СМП №716, административного помещения. Доля продавца в праве постоянного пользования на земельный участок: 917/1000

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012743260072; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012743260098; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by. Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 03.05.2017

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **21.06.2017** в **13.30** по адресу: **г. Минск, ул. Советская, 8 ОАО «Трест Белтрансстрой»** |
| **Дата, время и место окончания приема документов** | **19.06.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42; auction@cpo.by; www.cpo.by** |

---

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. №430/С-726 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – автостанция), площадью 32,9 кв. м, расположенное по адресу: Новогрудский р-н, Волковичский с/с, г.п. Любча, ул. 1 Мая, 30 |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 424385790401000054 (назначение – для обслуживания зданий и сооружений автокассы г.п. Любча), площадью 0,0365, расположенном по адресу: Новогрудский р-н, Волковичский с/с, г.п. Любча, ул. 1 Мая, 30 |
| **Начальная цена продажи** | 4 748 р. (четыре тысячи семьсот сорок восемь рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 237 р. (двести тридцать семь рублей) |
| **Условия аукциона** | аукцион без условий |
| **Продавец** | Филиал «Автобусный парк №5» ОАО «Гродноoблавтотранс», 231400, г. Новогрудок, ул. Индустриальная, 6, тел. 44733 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 5 июля 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:
заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:
представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.
Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**
**Последний день приема заявлений – 30 июня 2017 г. до 15.00**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
*http://grodnoino.by/*

---

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Узденское РАЙПО, Минская обл., г. Узда, пер. К. Маркса, 7 |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| **Административное здание, кондитерский цех** | Здание административно-хозяйственное | 646,2 кв. м | 623/С-58122 | Минская обл., Узденский р-н, г. Узда, пл. Свободы, 9 |

| | |
|---|---|
| **Составные части и принадлежности** | Подвал, кирпичная пристройка |
| **Сведения о земельном участке** | Земельный участок, общ. пл. 0.1481 га, предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания административно-производственного здания. Ограничения (обременения) прав: охранная зона ЛЭП до 1000 вт, площадь 0,0104 га |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **220 494,12 белорусских рублей** |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с 3012343260010 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». В формате IBAN: р/с BY60BLBB30120191021390001001, БИК BLBBBY2X

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **05.07.2017** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **30.06.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

■ Гісторыя газеты — гісторыя краіны

# ПАЎТАРЫЎ ЛЁС МНОГІХ «ЗВЯЗДОЎЦАЎ»

**У 1927 годзе, калі газета адзначала першае сваё дзесяцігоддзе, у «Звязду» ўладкаваўся партызан з Заходняй Беларусі, непрымірымы змагар з польскімі панамі Сцяпан Жабінскі. Праз 90 гадоў гісторыю яго жыцця нам расказаў яго унук — жыхар Віцебска Аляксандр ГАРАЛЁЎ.**

## Герой Першай сусветнай

— Сцяпан Антонавіч Жабінскі нарадзіўся ў сялянскай сям'і ў 1894 годзе ў Гродзенскай губерні. Атрымаў дыплом настаўніка ў Свіслачы, дзе скончыў семінарыю. Ваяваў у Першую сусветную. За геразім быў узнагароджаны Георгіеўскім крыжам. Цудам захавалася фатаграфія таго часу, — расказвае ўнук былога «звяздоўца».

Сцяпан цудам выжыў пасля прымянення немцамі хімічнай зброі. У 1918 годзе вярнуўся дадому.

Сваякі беражліва захоўваюць арыгінал яго ўспамінаў, набраны на друкаванай машынцы. Радкі пра ўдзел Сцяпана Жабінскага ў барацьбе на тэрыторыі Заходняй Беларусі можна прачытаць у кнізе «Гады выпрабаванняў і мужнасці». Яна была падрыхтаваная да друку ў 1973-м выдавецтвам «Беларусь».

«У лiпенi 1920 года пад націскам Чырвонай Арміі польскія войскі пачалі адступаць. Усе мы з нецярпеннем чакалі хутчэйшага вызвалення і спрыялі гэтаму ўсімі даступнымі сродкамі... Насельніцтва ўрачыста сустрэла чырвонаармейцаў. У гэты ж дзень у Свіслачы адбыўся першы адкрыты сход камуністычнай арганізацыі. Быў абраны валасны камітэт. Я стаў яго старшынёй», — пісаў Сцяпан Антонавіч.

## Падначалены Дзяржынскага

У вызваленым Беластоку быў створаны Часовы польскі рэвалюцыйны камітэт. Ім кіравалі Юльян Мархлеўскі і Фелікс Дзяржынскі. Камітэт распрацаваў праграму сацыялістычных мерапрыемстваў у Польшчы.

«Наш рэўкам першай сваёй задачай лічыў паляпшэнне жыцця працоўных. Мы ўзялі на ўлік ураджай у маёнтках, арганізавалі грамадскія кухні, у якіх атрымлівалі харчаванне чырвонаармейцы і бежанцы, якія вярнуліся. У Свіслачы, у будынку настаўніцкай семінарыі, адкрылі бібліятэку, па вёсках стваралі хаты-чытальні і народныя дамы. Нашы агітатары адпраўляліся ў вёскі, выступалі там з лекцыямі і дакладамі перад насельніцтвам», — успамінаў Жабінскі.

Калі палякі заручыліся падтрымкай Антанты, летам 1920 года ўлада змянілася. І Сцяпан Жабінскі вымушаны быў перайсці на нелегальнае становішча. Калі яго малая радзіма перайшла пад юрысдыкцыю Польшчы, ён пайшоў у партызаны. Не раз за рэвалюцыйную барацьбу яго арыштоўвалі.

## Вязень польскіх турмаў

У Вільне ён браў актыўны ўдзел у байкоце выбараў у сейм. Калі знаходзіўся ў турме ў Варшаве, восенню 1922 года ў Польшчы выбіралі прэзідэнта. Сцяпан Жабінскі тады напісаў зварот да беларускай моладзі. Ліст перахапілі польскія ўлады.

Ён напісаў: «Польскія паны заўсёды плакалі, што Польшчу падзялілі і прыгняталі яе ворагі. А што цяпер робяць яны самі? Без малога за тры гады свайго незалежнага існавання польскія паны пралілі ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне столькі слёз, што ўся Польшча афарбавалася ў чырвоны колер... Што датычыцца мяне, скажу: жэрабя кінутае, барацьба з панамі — да смерці!»


**Сцяпан ЖАБІНСКІ з Георгіеўскім крыжам на грудзях.**

Гэты зварот зачыталі падчас судовага працэсу. Жабінскага прысудзілі да чатырох гадоў строгага турэмнага заключэння. Калі знаходзіўся ў турме каля нямецкай мяжы, ледзь выжыў. Бо зімой 1924—1925 гадоў там не тапілі. На сценах камер быў іней. А самым страшным месцам была лазня. У ёй прымушалі вязняў прымаць халодны душ, каб потым адвесці ў ледзяныя камеры. Зняволеныя лічылі час знаходжання ў турме не гадамі, а колькасцю лазняў...

## Ахвяра савецкіх рэпрэсій

У 1927-м Сцяпан Жабінскі цудам дабраўся да тэрыторыі, дзе была савецкая ўлада.

— Мая мама чула ад дзеда падрабязнасці таго рызыкоўнага пераходу. Ён з сябрамі заплаціў грошы тым, хто ведаў, як можна перайсці мяжу. Правялі па лесе. А далей сказалі, што неабходна хуценька перабегчы поле. І калі яны перабягалі поле, па ім сталі страляць з польскага боку. А на савецкай тэрыторыі іх сустрэлі ўзброеныя людзі, якія былі настроеныя таксама вельмі агрэсіўна. Напэўна, прынялі групу за дыверсантаў, або кантрабандыстаў. Такіх, дарэчы, у той час было нямала на польска-беларускай мяжы, — працягвае ўнук Жабінскага.

У «Звяздзе» былы падпольшчык і партызан працаваў з 1 жніўня 1927 года да 3 сакавіка 1933-га. Перакладаў з польскай мовы. Потым быў намеснікам загадчыка і кіраўніком сектара замежнай інфармацыі.

— Быў, як кажуць, на кароткай назе з вядомымі людзьмі. Калі хаджу па Мінску, радуюся, што дзед ведаў тых, у гонар каго назвалі многія вуліцы. Маёй маме, напрыклад, расказваў пра Купалу, Прытыцкага і іншых. На жаль, не захаваліся віншавальныя паштоўкі ад іх, лісты, сумесныя фотаздымкі. І можна зразумець — чаму. Калі навісла пагроза рэпрэсіі, хатні архіў амаль што поўнасцю прыйшлося знішчыць, — тлумачыць Аляксандр Гаралёў.

З 1934 года Сцяпан Жабінскі падчас ссылкі жыў у Хабараўскім краі. А з 1937 года — у сяле Красное Бранскай вобласці. Там у яго нарадзіліся сын і дзве дачкі.

Былы журналіст выкладаў у школах. Падчас Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі ў падполлі дапамагаў партызанам...

Пасля рэабілітацыі мог патрабаваць вяртання 2-пакаёвай кватэры ў цэнтры Мінска, уладкавацца на прэстыжную пасаду, але не стаў гэтага рабіць. Жыў з сям'ёй у Віцебску. Працаваў настаўнікам. Крыўды на савецкую ўладу не трымаў.

Памёр Сцяпан Жабінскі ў 1975-м годзе. Яго сын займаў адказную кіраўнічую пасаду на караблебудаўнічым заводзе ва Украіне. Старэйшая дачка на Гродзеншчыне працавала галоўным заатэхнікам. У жывых на сёння толькі малодшая — маці Аляксандра Гаралёва. Цяпер Людміле Сцяпанаўне за 70.

Унук Жабінскага Аляксандр Генадзевіч Гаралёў, якому рэдакцыя ўдзячна за расказ пра дзеда, не звязаны са СМІ. Даслужыўся да палкоўніка ў сістэме МУС. Пенсіянер, але працуе... Падчас службы ахвотна супрацоўнічаў з рэдакцыямі, асабліва з карпунктам «Звязды». І толькі нядаўна прызнаўся, што «Звязда» для яго сям'і — родная газета без перабольшання.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*


**Даведка з рэдакцыі газеты «Звязда».**

■ Повязь Роду

# НЯБЕСНАЯ І ЗЯМНАЯ ПАРЫ

## Каго першага хаваць на новых могілках

У народнай песеннай спадчыне беларусаў шырока выкарыстоўваецца прыродна-сацыяльны паралелізм — такі паэтычны прыём, калі ўнутраны стан чалавека перадаецца праз знешне праяўлены стан прыроды. Сталася так, што нябесная пара — Сонца і Месяц — аказалася правобразам паэтычнага асэнсавання той сямейнай пары — мужа і жонкі, — якой наканавана працягваць свой род. У фальклоры два нябесныя свяцілы суадносілі адно з адным, надзяляючы іх рысамі чалавека і далучаючы адно да другога пэўнай ступенню сваяцтва.

Часцей за ўсё Сонца і Месяц лічылі мужам і жонкай (асабліва шырока ў калядных і велікодных гімнічных песнях, а таксама ў вясельнай паэзіі), радзей — братам і сястрой. Даследчыкі лічаць, што за гэтай з'явай стаіць жаданне чалавека інтэграваць сябе ў космас, а гэта можа адбыцца толькі тады, калі чалавек прывядзе сябе ў гармонію з астральнымі рытмамі, фактычна паяднаўшы абодва свяцілы ў сваім арганізме. У такім разе паэтычныя аналогіі маюць надзвычай глыбінны сэнс. Праводзячы на першы погляд толькі псіхалагічную паралель, якая дапамагала праз вонкавае, візуальнае ўспрыманне стану прыроды зазірнуць у душэўны свет асобнага чалавека або сямейнай пары, паэтычны твор адкрываў нам таямніцы зусім іншага кшталту. Ён імкнуўся давесці думку аб тым, што сітуатыўная сугучнасць або нават і магчымая суаднесенасць насамрэч з'яўляюцца праяўленнем бязмежнага космапланетарнага адзінства. Менавіта так — непадзельнага адзінства, у якім прырода і соцыум — гэта цэласны арганізм, у якім адно не проста перацякае ў другое, а суіснуе ў непарыўнай гармоніі, узаемаспалучэнні. Космас, прырода, зямля і любы сацыяльны арганізм (су)існуюць у адзіным энергаінфармацыйным полі Сусвету. Гэтую гармонію неабходна разумець, імкнуцца падтрымліваць, прымаючы той неабвержны факт, што яе парушэнне на адным полюсе існавання абавязкова адгукнецца негатыўным чынам на другім. Асабліва шматпланава ідэя падзейнай сугучнасці прадстаўлена ў вясельнай і веснавой абрадавай паэзіі. У вясельных песнях чырвонай ніткай праходзіць зварот да нябёсаў аб Боскай літасці і спагадзе тым, хто абраў шлюб (актуалізуецца вектар Неба — людзям). І, наадварот, у веснавой паэзіі гучыць просьба да моладзі перадшлюбнага ўзросту максімальна паспрыяць абуджэнню зямлі і распачынанню новага цыкла вегетацыі збожжавых культур (актуалізуецца супрацьлеглы вектар: людзі — зямлі і Небу).

ТОЛЬКІ тады, калі мы будзем мець на ўвазе ідэю існавання космапланетарнага і сацыякультурнага су-Лад-дзя, зможам наблізіцца да разумення таго этнакультурнага феномена, з якім давялося сутыкнуцца ў адной з вёсак Лепельскага раёна. У 80-я гады мінулага стагоддзя перад мясцовымі жыхарамі паўстала патрэба адкрыць новыя могілкі. Яны разумелі, што ўсё новае (узведзенае, распачатае, змайстраванае, набытае) вымагае правядзення адпаведнага комплексу абрадавых дзеянняў, скіраваных на ўжыўленне-ўключэнне гэтага новага ў рэчышча ўжо існуючай жыццёвай традыцыі.

Адкрыццё новых могілак суправаджалася надзвычай цікавым і змястоўным па сутнасці рытуалам, у якім безумоўнай дамінантай стала ўсё тая ж нябесная і зямная пары «неразлучнікаў». На працягу некалькіх дзён вялася актыўная падрыхтоўка да незвычайнай падзеі, якая можа паўтарацца толькі раз на сто гадоў. Мясцовыя жанчыны рыхтавалі дзве вялікія, у рост чалавека, лялькі: мужчыны і жанчыны сталага веку. Тым часам мужчыны зрабілі дзве сапраўдныя труны, у якія і палажылі роставыя лялькі. А далей усе падзеі разгорталіся ў адпаведнасці з мясцовым пахавальным абрадам. На трэці дзень, у памінальную суботу, па вёсцы рушыла сімвалічная пахавальная працэсія: жанчыны галасілі, мужчыны неслі на руках абедзве труны аж да самых могілак. У цэнтры тэрыторыі будучага мясцовага акропаля былі выкапаны дзве магілы, у адну з якіх і апусцілі труну з лялькай мужчыны, у суседнюю — з рытуальным выявай сталага веку жанчыны. Вечарам адбылася памінальная трызна. І толькі пасля гэтага могілкі пачалі «засяляць» тымі аднавяскоўцамі, якія адышлі ў нябыт.

ГЭТЫ ўнікальны абрад цалкам стасуецца з мясцовай традыцыяй штогадовага «Пахавання дзеда» і «Пахавання бабы», якія выконваюцца на пачатку масленічнага тыдня. Логіка абрадавых падзей Віцебшчыны абапіраецца на жыццёвыя заканамернасці і цалкам сугучна ім. У шэрагу рэгіёнаў Падзвіння да нашага часу захаваўся ўнікальны святочна-абрадавы комплекс «Жаніцьба Цярэшкі». На другім тыдні калядных святкаванняў у адной з вясковых хат збіралася моладзь перадшлюбнага ўзросту і ладзіла гульню, падчас якой загадзя абраныя «баба» з «дзедам» павінны былі звесці (а ў абрадавай тэрміналогіі гэта называлася «скруціць») пары маладых людзей. Мясцовы танец быў дынамічным. А ўсе яго фігуры нагадвалі кручэнне планет на нябеснай сферы. Вось гэты феномен касмічнага светаўпарадкавання і палажылі ў аснову звядзення будучых сямейных пар. Сімвалічны змест абрадавых падзей таксама быў зразумелы. Тыя, хто адказваў за захаванне родавых традыцый, — баба і дзед — звязлі-злучылі прадстаўнікоў маладога пакалення, перадалі ім жыццёвую эстафету і, адпаведна, павінны былі адысці ў вечнасць. Вось таму на Масленіцу, якая, уласна кажучы, і сімвалізавала завяршэнне працяглага зімовага спачыну прыроды і яе абуджэнне на новым вітку касмічнага коласавароту, і праводзіліся абрады сімвалічнага пахавання старых, каб тым самым саступіць дарогу новай энергіі жыццяўтварэння.

ДРУГІМ фундаментальным крытэрыем апісаных абрадавых падзей быў прынцып падабенства. Памятаеце наша перадновагоднее: «Як сустрэнеш Новы год, такім ён і будзе». Вось таму на Лепельшчыне і хавалі «старую сямейную пару», каб тым самым заручыцца адпаведным паразуменнем у нябёсаў забіраць «на той свет» толькі састарэлых і знямоглых людзей. А што, калі чалавек парушаў гармонію космапланетарнага суладдзя? На наш погляд, якраз такое парушэнне адбылося ў іншым куточку Беларусі. Мясцовыя людзі расказалі: у Салігорску некалі адкрывалі новыя могілкі. Здарылася так, што першае пахаванне аказалася непрадказальным: там пахавалі маладую сямейную пару, якая загінула ў аўтамабільнай катастрофе. Старая бабуля, якая прысутнічала на пахаванні, прадракала: вялікая бяда будзе. І сапраўды: у самы блізкі час на гэтых могілках было пахавана дзевяць маладых сямейных пар і толькі пасля гэтай вельмі балючай кампенсацыі людской абрадавай неадукаванасці сітуацыя «супакоілася». Калі ж мы звярнуліся да старой бабулі з просьбай растлумачыць незвычайнасць падзей, то адказ быў простым і зразумелым: першымі на новых могілках трэба хаваць толькі сталага веку людзей. Пры гэтым удакладніла: пажадана пахаваць мужчыну, які жыў адзін, ён жанчыну, якая таксама векавала адна.

ПРЫНЦЫП цотнасці-парнасці вытрымліваўся ў розных абрадавых сітуацыях, звязаных з накіраванасцю ў будучыню. Так, сёння практычна ніхто не ведае адзін з самых цікавых «сакрэтаў», звязаных з распачынаннем ужо самога цырыманіялу вяселля. Бацькі нявесты (а менавіта ў іх хаце ўсё пачыналася) дамаўляліся з сямейнай парай блізкіх сваякоў, каб яны прыйшлі першымі з усіх запрошаных гасцей. Мелася на ўвазе, калі першыя госці прыйдуць парай, то і заручаная пара пражыве доўгі сумесны век.

**Аксана КАТОВІЧ,**
**Янка КРУК.**

*Паважаныя чытачы! Аўтары рубрыкі чакаюць ад вас допісаў з апісаннем цікавых абрадаў вашай мясцовасці. Дасылайце свае гісторыі на паштовы або электронны адрас «Звязды» з пазнакай «Повязь Роду».*




## ЖАНІСЯ, КАБ ЛЮДЗІ НЕ ЗВЯЛІСЯ...

Антон быў дзяцюк хоць куды — працавіты, спакойны, прыгожы. І не стары: меў «шчэ толькі трыццаць тры», як спяваецца ў вясёлай песні. Адно, што непакоіла ягоных бацькоў, — ажаніцца не мог: баяўся дзяўчат і ўсё тут.

Вырашыць праблему дапамог выпадак.

Неяк у трэці надвячорак Вялікадня сышліся калгасныя механізатары ў бярэзнічак, каб употай (бо афіцыйна ў той час не дазвалялася) адзначыць свята. Быў сярод іх і Антон. Прычым да чаркі ён звычайна не прыкладваўся — хіба чыста для прыліку. На гэты ж раз — каўтануў і нават лішняга, а таму — асмялеў, стаў рвацца некаму «чайнік чысціць»...

— Дык, можа, і ў сваты з'ездзіш, раз такі смелы? — спытаў адзін з сябрукоў.

— А чаму б і не, — падахвоціўся Антось. — Магу. І л-лёгка!..

Усё далейшае рабілася дружна і без аглядкі: адзін з хлапцоў панёсся да бабкі Аўдоцці па гарэлку, другі, што нядаўна жаніўся, — дамоў, па свой шлюбны касцюм, трэці — па кветкі (у калгаснай дыспетчарскай ва ўсю красавала герань), чацвёрты — у чырвоны куток па графін.

У яго (каб культурней было) пералілі прынесены самагон. «Прыбралі» жаніха: рукавы ў пінжаку давялося падвярнуць, калошы — заправіць у гумовікі — завялікі аказаўся касцюмчык...

Паспрачаліся крыху, на чым ехаць. Вырашылі, што найлепш — на трактары з сеялкай. Размеркаваліся так: трое — горды за сябе практыкант (ён жа кіроўца), жаніх з геранню і сват, празваны Балалайкай (за здольнасць гаварыць не змаўкаючы), — у кабіне, астатнія — ззаду на сеялцы, бо колькі там той дарогі...

Тут і праўда трэба сказаць колькі: гэта значыць, да каго ж яны ехалі.

У суседнім калгасе конюхам працаваў Сцяпан — дзядзька мажны, рыжавалосы, круты: з ім (уся акруга ведала) да трох — не гавары...

І была ў гэтага Сцяпана дачушка: знешне — выліты бацька, а вось характарам — якраз наадварот: па маці пайшла — ціхая, сарамлівая. На той час ёй 29 ужо мінула. Можна сказаць, засядзелася дзеўка...

Як праходзіў працэс яе сватання, не так ужо і важна. Важны вынік: сват Балалайка падвёў Антося да пунсовай ад сораму Мані, паставіў іх побач (жаніх, як аказалася, амаль на галаву ніжэйшы) і натхнёна аб'явіў:

— Вы ж паглядзіце, якая пара! Вачэй не адвесці! І лепшай — не падабраць!

Пасля гэтай гучнай заявы «бакі» адразу ж прыйшлі да згоды і ўдарылі па руках. Кандыдат у зяці ва ўсю гаварыў кампліменты нявесце, цалаваў ручкі будучай цешчы і ўвогуле паводзіў сябе як належыць закаханаму жаніху. Але... толькі ў той дзень. Бо назаўтра, працверазеўшы, ён ужо думаў: «Во да чаго даводзіць гарэлка! Болей — у рот не вазьму, а то, не дай бог, яшчэ што адмачу!»

На тое, што «адмачыў» напярэдадні, ён вырашыў забыцца — выкінуць з галавы, як страшны сон.

І з некім іншым гэта, магчыма, атрымалася б, але не са Сцяпанам, бо той, убачыўшы, што жаніх пасля сватання нават носа не паказвае, стаў хваляваліцца. А далей — асядлаў найлепшага каня і памчаў разбірацца.

Антонаў трактар адшукаў у полі. Спыніў, выцягнуў з кабіны трактарыста (бо сам той не вылазіў), спытаў, што адбываецца.

— Дык нічога такога, дзядзечка, — паспрабаваў бараніцца жаніх. — Мы проста выпілі, пажартавалі...

— Што-о?! — твар Сцяпана стаў чырвоным, як бурак. — Пажартавалі?! А пра дзеўку вы падумалі? Ёй жа зараз хоць з хаты не выходзь!.. Жаніся, гад! А не то галаву скручу і не здрыгануся! (Сцяпан — для большай пераканаўчасці — падняў Антося за шкірку і што ёсць сілы страсянуў.)

— Добра, добра, — прахрыпеў жаніх. — Я згодны... Толькі жыць мы будзем асобна.

— Адразу б так, — умомант падабрэў конюх і адпусціў сваю пасінелую ахвяру. — Жаніцеся і жывіце!

...Вы не паверыце, але Антон з Маняй сапраўды жывуць — дагэтуль, і душа ў душу, што называецца. Чацвёра дзяцей нарадзілі і ў людзі вывелі: трох сынкоў — рыжых, як маці, і невялічкіх, як бацька, і адну дачушку, Святлану — бялявую і высокую, любіміцу дзеда Сцяпана.

**Алена Несцяронак,**
*г. Докшыцы.*

## ГУМКА ПАДВЯЛА?

Не ўсё адбываецца, як чалавек спадзяваецца.

А добра ж пачыналася! Вечарам, калі Мікалай Ігнатавіч ужо збіраўся зачыняць краму, туды завіталі яго прыяцелі, узялі напавер дзве пляшкі віна, са смакам прапусцілі па першай, па другой, закурылі, загаварылі...

Крамнік Мікалай Ігнатавіч любіў гэтыя ціхія «бяседы», бо з кожнай паўлітэркі (гэта па-першае) кілішакдругі даставаўся яму. Па-другое, быў прыбытак (хоць і адкладзены) ягонай краме, па-трэцяе, якая-ніякая кампанія...

Адзінае — грошы на закуску яна не траціла: «заядала рукавом» (у лепшым выпадку) ці нейкім ледзянцом. Ігнатавічу, шчыра кажучы, гэта не падабалася, таму ў кішэнях ён заўжды трымаў добрую жменю сушаных яблыкаў: зручна — выпіў і жуй на здароўе.

Але ж і на... шкоду таксама.

У той вечар сябрукі засядзеліся — выпілі шмат. Адпаведна, крамніку перапала таксама: дадому ледзьве прыпоўз.

А горш за тое, раніцай з ложка падняўся, у люстэрка глянуў і як не самлеў: увесь рот у яго быў... сіні — быццам не віно, а сапраўднае чарніла ўчора смакталі. «Што за ліха?» — падумаў Ігнатавіч і аж збялеў ад здагадкі: усунуў руку ў правую кішэнь, дзе — апроч яблыкаў — заўжды трымаў пячатку, дастаў яе і не пазнаў: «гумкі» і след прастыў.

— Няўжо з'еў, зжаваў разам з яблыкамі? — не верыў крамнік, ужо ўяўляючы, якія непрыемнасці яго чакаюць. — А можа, усё ж такі цэлую глынуў?

У надзеі на гэта ён, бедны, цэлы дзень замест прыбіральні хадзіў у бліжні лясок. Але без толку...

Назаўтра разам з бухгалтаркай, якая ехала ў банк, ён накіраваўся ў райпо. Шчыра, як на духу, ва ўсім прызнаўся свайму непасрэднаму начальніку. Думаў, што той (ну зямляк жа!) проста пасмяецца. Аднак не: шэф стукнуў кулаком па стале і сказаў:

— До, брат! Я заплюшчваў вочы, калі ў цябе былі недастачы, калі ты ад крамы згубіў ключы і калі, паспрачаўшыся на каньяк, тую самую пячатку паставіў на азадак чужой палюбоўніцы... А зараз — прабач: садзіся і пішы заяву на звальненне.

...Дамоў Мікалай Ігнатавіч ехаў, мякка кажучы, хмуры. Яшчэ б — страціў такую працу, такое цёплае, утульнае месца. І было б з-за чаго? З-за нейкай гумкі!

**Анатоль Кашэвіч,**
*в. Чырвонабярэжжа, Лельчыцкі раён.*

## КОРЖЫКІ

...Школьнікам я вельмі чакаў канікулаў. А ўжо паехаць тады ў вёску да дзеда з бабуляй гэта і наогул блакітнай марай было!

Не падумайце — вабілі да іх не булкі з сырадоем, не рэчка з рыбалкай. Дзядуля працаваў у сталярцы, дзе стаяла мноства дрэваапрацоўчых станкоў, рубанкаў, фуганкаў... І дабіраўся ён да іх (кіламетры з чатыры, праз луг і лес) на новым «Мінскачы».

Іх, розныя матацыклы, любіў дзед проста без памяці! У ягоным гаражы быў яшчэ «ІЖ» з каляскай, каб ездзіць у горад, нейкі (магчыма, яшчэ трафейны) агрэгат без надпісаў — для паездак на сенакос. Там жа, на паліцах у гаражы, ляжала процьма розных запчастак, пакуль яшчэ непатрэбных для матацыкла «Мінск». Якраз на ім дзядуля ездзіў на працу і калі-нікалі браў з сабою мяне.

Я тады садзіўся ззаду, часам з-за шырокай дзедавай спіны высоўваўся насустрач ветру, часам, наадварот, — хаваўся за ёй.

Потым, прыехаўшы ў сталярку, дыхаў там свежымі стружкамі-апілкамі, назіраў, як дзядзькі працуюць, разам з імі абедаў, намінаючы розныя «прысмакі» з іх няхітрых ссабоек, а ў канцы працоўных дзён (асабліва тых, калі мужчын даймала «смага» і яны наталялі яе пладова-ягадным вінам) дзед Міця мог расшчодрыцца і ў вясковай краме купіць мне напітку ды нейкіх лахердзікаў — цукерак, пячэння.

З імі я ехаў дамоў: вешаў на руку шлем з прысмакамі, садзіўся ззаду, чапляўся за дзеда і... Праўду кажу: проста захлынаўся (не тое ад ветру, не тое ад шчасця), калі ён заводзіў матор, калі зрываўся з месца, бо ездзіў дзед так, як не ездзіў Шумахер!

Ну вось напрыклад: ляцім мы з ім, наперадзе — лес, а там, за павароткай...

Што там было — невядома, але нешта блiснула. «Міліцыя!» — спалохаўся дзед і, крыкнуўшы мне «Трымайся!», збочыў — «нырнуў» на нейкую нябачную сцежку.

Дрэвы сталі хвастаць нас сваім галлём, птушкі — хавацца ў небе, хвалі (гэта мы з разгону адольвалі лужы) падымацца вышэй галоў.

А потым быў луг, і наш з дзядулем «Мінскач» паляцеў на... статак кароў.

Як яны паспявалі адскочыць (ці дзед іх аб'ехаць?), я не зразумеў дагэтуль...

Нарэшце на той жа вялікай хуткасці мы ўляцелі ў двор. Тут, што называецца, дзед даў па тармазах, спыніўся — паставіў матацыкл на падножку, нечага збегаў у хату і, ужо вярнуўшыся, спытаў:

— А што ты, унучак, коржык не ясі?

— Я ўжо з'еў, — ледзь чутна прамовіў я, бо, кінуўшы вокам у шлем, убачыў там... шчопці крошак.

...Прайшлі гады, і ўсё змянілася: даўно няма дзядулевай сталяркі, не той стаў лес, не той і луг (бо зарос кустоўем)... Не стала, на жаль, і дзеда.

Але ж ён, як жывы, узнікае перад вачыма — побач з матацыклам, з жоўтым пашкрабаным шлемам...

Назаўжды ў маёй памяці засталася і тая паездка, пасля якой гэтак жа назаўжды... знікла цікавасць да матацыклаў.

А зрэшты, заракацца не буду, бо ўнукаў у мяне пакуль што няма.

**Генадзь Рыняк,**
*г. Бялынічы.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

■ Круглая дата

# ІШОЎ У КРАМУ — ТРАПІЎ У ЭФІР

## Радыё «Мір» адзначыла 20-гадовы юбілей

**Зрабіць гэта радыёстанцыя вырашыла незвычайна. На адзін дзень студыя пераехала ў сталічны гандлёвы цэнтр «Замак» і вяла адтуль прамы эфір. Слухачы змаглі жыўцом убачыць, як працуюць іх любімыя ды-джэі, а самі радыёвядучыя — пазнаёміцца з паклоннікамі.**

На працягу чатырох гадзін ды-джэі Юрый Цароў, Канстанцін Юманаў, Юля Навацкая, Каця Іўлева і Іра Клёнава забаўлялі слухачоў і прымалі «зорных» гасцей. У выязной студыі пабывалі Георгій Калдун, Вольга Рыжыкава, гурт DaVinci і многія іншыя. Некаторыя з гасцей — Ларыса Грыбалёва і Ягор Хрусталёў — і самі некалі працавалі на радыё «Мір».

Для паклоннікаў станцыі гэта быў шанц даведацца, што ж адбываецца па той бок прыёмніка. Напрыклад, у што адзеты запрошаныя «зоркі» (кароль беларускай поп-сцэны Аляксандр Саладуха прыйшоў у ярка-жоўтым спартыўным касцюме) і што наліта ў шклянках вядучых (усяго толькі пітная вада).

Музыкант Іван Вабішчэвіч, які выступаў у якасці вядучага і на тэлебачанні, і на радыё, прызнаўся, што на радыё адчувае сябе больш камфортна і душэўна: гэта заўсёды жывы эфір.

— 20 гадоў — сур'ёзная дата для любога бізнесу. У медыясферы тым больш складаней заставацца на плаву і быць вядомымі. Але вам гэта ўдаецца, — павіншаваў радыёстанцыю музыкант. — Ці будзе існаваць радыё праз 20 гадоў? Так, цяпер кажуць, што «аналагавыя» СМІ састарэлі і іх выцесніць інтэрнэт. Прыкладна тое ж самае казалі пра рок-н-рол. І апошнія гадоў 50 яго хаваюць. А ён становіцца ўсё лепшым.

Выязная студыя — не адзіны сюрпрыз, якім парадавала радыёстанцыя сваіх паклоннікаў. Напрыклад, падчас акцыі «Залей за юбилей» штодзень раздавалі па 20 літраў паліва!

**Дырэктар Нацыянальнага філіяла Міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «Мір» у Беларусі Уладзімір ПЯРЦОЎ** упэўнены:




20 гадоў — паважны ўзрост для любога медыя. Сёння FM-перадатчыкамі станцыі пакрыты ўсе абласныя і многія раённыя гарады.

— У нас дастаткова стабільная, салідная аўдыторыя, — кажа Уладзімір Пярцоў. — Мы ведаем прыкладны склад нашых слухачоў: мяркуючы па зваротнай сувязі, гэта людзі з добрай адукацыяй, сярэдняга і старэйшага ўзросту. Для іх мы і выстройваем нашу праграмную палітыку — музыку, навіны, забаўляльныя шоу.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■

# СМАЧНА ЕСЦІ!

## Запрашае фестываль вулічнай ежы

**Кірмаш «Фестываль вулічнай ежы» пройдзе 10 чэрвеня ў Мінску, паведамілі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.**

Фестываль адбудзецца з 10.00 да 22.00 каля Палаца спорту па праспекце Пераможцаў, 4. Абяцаюць шырокі асартымент страў розных кухняў свету, прыгатаваных на вачах у наведвальнікаў. Будуць прадстаўлены фуд-корты ад рэстаранаў і кавярняў, народны фастфуд з рэгіёнаў краіны, а таксама перасоўныя аб'екты грамадскага харчавання. На фестывалі разгорнуцца забаўляльныя пляцоўкі: гульнявыя зоны, пройдуць майстар-класы, конкурсы, паказы адзення і прычоскі, выступленні музыкантаў. Будуць працаваць дзіцячая пляцоўка з міні-атракцыёнамі, спартыўная пляцоўка з заняткамі па шэйпінгу, адбудуцца спаборніцтвы па армрэстлінгу і гіравым спорце.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

500 гадоў беларускаму кнігадрукаванню
Напачатку было Слова

■ Полацкі сшытак

# «Збіраючы добрыя думкі ў сэрцы сваім»

**Праз стагоддзі старажытныя аркушы, часам пажоўклыя, часам бляклыя, часам закапаныя свечкай, нясуць да нас словы невядомага аўтара: «Якой жа моваю, браты, належыць нам уславіць прамяністую памяць найшчаслівейшай нявесты Хрыстовай Еўфрасінні? Была яна памочніцаю пакрыўджаным, смуткуючым — суцяшэннем, неапранутым — адзеннем, хворым — наведваннем, проста сказаць — для ўсіх усім была Еўфрасіння. Бо сэрца сваё паіла яна Прамудрасцю Божаю. Еўфрасіння — неўвядальная кветка райскага саду! Еўфрасіння — арол, што ўзняўся ў неба і пралунаў ад Захаду да Усходу, як прамень сонечны, прасвятліў усю зямлю Полацкую. І вось, браты, хваліцца Салунь Дзімітрыем, а Вышгарад — пакутнікамі. А мы ж хвалім: шчаслівы ты, горад Полацкі, што ўзрасціў такі парастак, прападобную Еўфрасінню!»**



Выданне «Жыція Еўфрасінні Полацкай», зробленае ў 2012 годзе.

Імя прападобнай Еўфрасінні Полацкай — духоўнай настаўніцы, асветніцы, нябеснай апякункі зямлі Беларускай — займае асобае месца ў сэрцах і душах чалавечых.

Адной з асноўных крыніц аб жыцці і духоўным подзвігу князёўны-ігумені стала яе жыціе, якое па праву называюць бясцэннай жамчужынай старажытнага ўсходнеславянскага пісьменства. Жыціе, напісанае ў адпаведнасці з канонам, расказвае нам аб найважнейшых момантах жыцця прападобнай. Яно апавядае аб нараджэнні і выхаванні князёўны Прадславы: «Быў у горадзе Полацку князь па імені Усяслаў. І меў ён многа сыноў. І быў у яго сын па імені Георгій, ад якога нарадзілася гэтая блажэнная дзяўчына... Гадавала яе карміцелька, і дзень за днём расла дзяўчынка: цела малаком насычалася і расло, а душа Святым Духам напаўнялася». У ім чытаем аб яе прыгажосці і адукаванасці: «Па ўсіх гарадах разышлася вестка аб мудрасці яе, і аб добрым навучанні яе, і аб вобліку яе, бо была яна вельмі гожая тварам». Невядомы агіёграф паведамляе аб свядомай адмове дзяўчыны ад шлюбу з сынам уплывовага князя і аб яе выбары для сябе іншага шляху: «Ці не лепей за ўсё жыццё гэтае пастрыгчыся мне ў манахіні і быць у паслушэнстве ў ігумені, падпарадкоўвацца сёстрам і навучацца, як страх Божы зацвердзіць у сэрцы сваім і як цячэнне жыцця завяршыць?»

**«І так пачалі яны жыць у манастыры ў адзінадумстве і малітвах да Бога. І бачылі ўсе, што былі яны нібы душа адзіная ў двух целах».**

Жыціе сведчыць, што ў дванаццацігадовым узросце прыйшла яна да сваёй цёткі, удавы князя Рамана Усяславіча, ігумені манастыра, «употай ад бацькі і маці і ўсіх дамашніх», і прасіла дазволу прыняць манаскі пострыг. Ігумення, убачыўшы юнацкасць і прыгажосць дзяўчыны, адгаворвала яе ад гэтага кроку. «І разгубілася яна, і пачала целам пакутаваць і сэрцам жахацца. І твар да зямлі апусціўшы, на доўгі час панікла яна», — піша старажытны аўтар. Але юная князёўна здолела пераканаць цётку, прыняла пострыг пад іменем Еўфрасінні. І, чытаем далей, «як добры ваяўнік, узброіўшыся на ворага свайго д'ябла, жыла яна ў манастыры, падпарадкоўваючыся ігумені і сёстрам усім. І ўсіх перасягала яна ў посце, малітвах і няспанні начным. І з таго часу больш руплівую стала яна ў падзвіжніцтве, збіраючы добрыя думкі ў сэрцы сваім, як пчала соты». Пазней Еўфрасіння па дабраславенні епіскапа Ілы пасялілася ў келлі полацкага Сафійскага сабора: «Увайшла яна туды і пачала яшчэ адданей у посце весці жыццё падзвіжніцкае. І пачала яна кнігі пісаць сваімі рукамі. І плату, якую атрымлівала, аддавала яна бедным».

Праз некаторы час Еўфрасіння атрымала ад епіскапа Ілы ў дар Сяльцо для ўзвядзення там манастыра: «Калі дапаможа Бог, малітвамі іх і тваёю працаю ўзвядзецца месца вялікае!» Тут прынялі манаства дзве сястры прападобнай: родная Гарадзіслава (у манастве Еўдакія) і стрыечная Звініслава (у манастве Епраксія). Тут па яе дабраславенні дойлідам Іаанам была ўзведзена Спаса-Праабражэнская царква: «І была пабудавана царква ад пачатку за трыццаць тыдняў». Затым намаганнямі Еўфрасінні была ўзведзена другая мураваная царква Прасвятой Багародзіцы: «І ўзвяла яе, і абразамі ўбрала. Асвяціла яе і аддала манахам». Для гэтай царквы прападобная прасіла ў Царградзе (Канстанцінопалі) у імператара Мануіла Комніна і Патрыярха Лукі Хрысаверга абраз Прасвятой Багародзіцы Эфескай: «І бачыў цар любоў яе, паслаў да эфесян сто воінаў сваіх... І прынёс абраз Прасвятой Багародзіцы ў Царград. Патрыярх Лука сабраў епіскапаў і саборы ўсе ў Святой Сафіі і, дабраславіўшы, перадаў яго слугу прападобнай Еўфрасінні. Той жа прыняў яго з радасцю і прынёс спадарыні сваёй Еўфрасінні...»

У суправаджэнні сястры Епраксіі і брата Давіда выправілася Еўфрасіння ў паломніцтва ў Святую Зямлю. Там, у Іерусаліме, прападобная захварэла і спачыла. Пахавалі яе ў манастыры Святога Феадосія.

У 1187 годзе, калі Іерусалім асадзілі войскі егіпецкага султана Саладзіна, нятленныя мошчы прападобнай Еўфрасінні былі перавезены ў Свята-Успенскую Кіева-Пячорскую Лаўру, у 1910 годзе — перанесены ў Полацк, у родны Спаса-Еўфрасіннеўскі жаночы манастыр.



Рукапіс «Жыція Еўфрасінні Полацкай». XVI стагоддзе.
Захоўваецца ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбургу.

«Жыціе Еўфрасінні Полацкай» — адзін з ранніх помнікаў усходнеславянскай агіяграфіі. Да нашых дзён «Жыціе Еўфрасінні Полацкай» дайшло толькі ў позніх спісах (XV—XVIII стст.). Усе яны падзяляюцца даследчыкамі на некалькі рэдакцый.

Вядомыя сёння спісы «Жыція Еўфрасінні Полацкай» (звыш 180) знаходзяцца за межамі Беларусі, у кнігасховішчах Расіі, Украіны, Літвы, што значна абцяжарвае магчымасць доступу да іх зацікаўленых асоб. Работа з арыгіналамі важная ў першую чаргу для мовазнаўцаў, але таксама мае значэнне і для іншых спецыялістаў, паколькі пры вывучэнні канкрэтнага тэксту неабходна ўлічваць не толькі яго змест, але і мець уяўленне аб гісторыі яго стварэння, перапісвання, аб далейшым лёсе рукапісу, у якім ён змешчаны. У пэўнай ступені садзейнічае гэтаму выданне старажытных тэкстаў. Першыя публікацыі «Жыція Еўфрасінні Полацкай» былі ажыццёўлены яшчэ ў другой палавіне XIX ст. (выданні Г. Кушалёва-Безбародкі, М. Дуброўскага, А. Сапунова). Навуковыя выданні твора пачалі з'яўляцца з другой палавіны XX ст. (напрыклад, у «Хрэстаматыі па старажытнай беларускай літаратуры» А. Коршунава (1959), «Хрэстаматыі па гісторыі беларускай мовы» (Ч. I, 1961). У 1994 г. А. Мельнікавым апублікаваны адаптаваны царкоўнаславянскі тэкст «Жыція Еўфрасінні Полацкай» па спісе XVI ст. і яго пераклад на беларускую мову («Кніга жыццяў і хаджэнняў»). У 2005 г. выдадзены падрыхтаваныя гэтым даследчыкам тэксты асноўных спісаў рэдакцый тэксту з паказаннямі рознагачытанняў па іншых спісах рэдакцый у спасылках («З неапублікаванай спадчыны»). Пераклад жыція на беларускую мову «Аповесць жыцця і смерці Еўфрасінні Полацкай» здзейснены таксама І. Саверчанкам («Старажытная беларуская літаратура (XII—XVII стст.)», 2007). Шэраг выданняў «Жыція Еўфрасінні Полацкай» падрыхтаваны сёстрамі Спаса-Еўфрасіннеўскага жаночага манастыра ў Полацку. У 2012 г. у выдавецтве Беларускай праваслаўнай царквы ўбачыла свет кніга «Житие блаженной Евфросинии, игумении Вседержителя Святого Спаса во граде Полоцке», якая ўключае факсіміле «Жыція Еўфрасінні Полацкай» (па спісе, змешчаным у зборніку XVI ст., які захоўваецца ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы, Санкт-Пецярбург, Пагодзінскі збор), узноўлены тэкст, беларускі, рускі і англійскі пераклады тэксту. Кніга была падрыхтавана выдавецтвам сумесна з Інстытутам мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі (узнаўленне рукапіснага тэксту, пераклады на беларускую і рускую мовы ажыццёўлены вядучым навуковым супрацоўнікам інстытута Эльвірай Ярмоленкай; цытаты ў артыкуле падаюцца па гэтым выданні).

Нягледзечы на вялікую колькасць грунтоўных навуковых даследаванняў «Жыція Еўфрасінні Полацкай», па-ранейшаму не высветленымі застаюцца пытанні часу і месца стварэння жыція, аўтарства і суадносін паміж рэдакцыямі твора.

На думку даследчыкаў, жыціе было створана ў канцы XII ст., неўзабаве пасля спачыну прападобнай Еўфрасінні, падчас фарміравання царкоўнага шанавання яе. Першапачатковы тэкст жыція невядомы. Мяркуюць, што спачатку было складзена пролажнае (кароткае) жыціе, перапрацаванае і пашыранае пазней, відавочна, недзе ў канцы XV — пачатку XVI ст.

Аўтар найстаражытнейшага жыція застаўся невядомым. Даследчыкі схіляюцца да таго, што ім быў не проста сучаснік Еўфрасінні Полацкай, а чалавек, блізкі да яе кола. Сярод магчымых аўтараў жыція называюць Міхаіла, слугу Еўфрасінні («І паслала яна слугу свайго Міхаіла ў Царгорад да цара Мануіла і да Патрыярха Лукі з дарамі найкаштоўнейшымі»), які, магчыма, быў манахам мужчынскага манастыра, заснаванага прападобнай; манаха Давіда («І так пайшла яна ў Іерусалім, узяўшы з сабою брата свайго Давіда і сястру сваю Епраксію»); манахіню Епраксію — сястру і спадкаемніцу Еўфрасінні, якая была побач з прападобнай доўгія гады («І так пачалі яны жыць у манастыры ў адзінадумстве і малітвах да Бога. І бачылі ўсе, што былі яны нібы душа адзіная ў двух целах»).

**Па-ранейшаму не высветленымі застаюцца пытанні часу і месца стварэння жыція, аўтарства і суадносін паміж рэдакцыямі твора.**

«Жыціе Еўфрасінні Полацкай» напісана на царкоўнаславянскай мове. Эльвіра Ярмоленка, даследчыца моўных асаблівасцяў рукапісу, адзначыла, што наяўнасць у тэкстах формаў парнага ліку, складанай сістэмы мінулых часоў, спецыфічных сінтаксічных сродкаў сведчыць аб рэалізацыі ў жыцці строгай («высокай») царкоўнаславянскай нормы, г. зн. і аўтар, і затым перапісчыкі імкнуліся прытрымлівацца выпрацаванага эталона. Таму моўныя асаблівасці, якія дазваляюць вызначыць месца напісання таго ці іншага тэксту або тэрытарыяльную прыналежнасць перапісчыка, у спісах нячастотныя. Так, у спісах Зборнікаў змешанага складу спарадычна сустракаюцца адзінкавыя выпадкі акання *(добрата* замест *доброта),* пераходу *[в]* у *[ў] (пребывати у церкви* замест *пребывати в церкви),* зацвярдзення шыпячых *(жытиа* замест *житиа),* зацвярдзенне р мяккага *(декобъра* замест *декобря)* і інш.

«Жыціе Еўфрасінні Полацкай» адлюстроўвае разнастайныя моўныя працэсы, якія мелі месца ў царкоўнаславянскім пісьменстве ў XVI—XVII стст. Прэзентуючы адзін з найважнейшых яго жанраў — агіяграфію, яно, несумненна, садзейнічала замацаванню нормаў царкоўнаславянскай мовы не толькі на тэрыторыі Полаччыны, але і ў цэлым на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага і Вялікага Княства Маскоўскага.

**Наталля ПАЛЯШЧУК**

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | ОАО «Реммех», 220024, г. Минск, ул. Бабушкина, 48. Тел. +375 (17) 291-83-47 |

**Предмет аукциона**

**Транспорт, спецтехника и оборудование, расположенные по адресу:** г. Минск, ул. Бабушкина, 48, в составе:

| № лота | Инв. номер | Наименование | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | - | **Трактор Т-170Б** | 10 325,00 | 516,25 |
| 2 | 10024 | **Ножницы гильотинные НА 3225** | 15 156,12 | 757,81 |
| | 1112323 | **Тележка под гильотину с путями S32** | | |
| | 4194 | **Установка роликовая для резки** | | |
| 3 | 4211 | **Пресс-ножницы 3Н5222** | 2 261,70 | 113,09 |
| 4 | 5160 | **Сварочный полуавтомат JackleMIG 326 G** | 926,10 | 46,31 |
| 5 | 5158 | **Сварочный полуавтомат JackleMIG 500TS** | 1 102,50 | 55,13 |
| 6 | 999968 | **Полуавтомат Powertec 250C** | 355,32 | 17,77 |
| 7 | 999969 | **Полуавтомат Powertec 250C** | 355,32 | 17,77 |
| 8 | 1018 | **Полуавтомат Powertec 250C** | 426,30 | 21,32 |
| 9 | 10022 | **Полуавтомат Powertec 300** | 470,40 | 23,52 |
| 10 | 5077 | **Сверлильный станок 2Н135** | 790,44 | 39,52 |
| 11 | 4071 | **Станок токарно-винторезный 16 в-20** | 4 456,20 | 222,81 |
| 12 | 4035 | **Универсальный трубогибочный механизм ТГС-5** | 1 206,24 | 60,31 |
| 13 | 4591 | **Контейнер металлический, 2014 г. в.** | 130,20 | 6,51 |
| 14 | 41000001 | **Станок радиально-сверлильный 2Н55Ф2, 1971 г. в.** | 3 990,00 | 199,50 |
| 15 | 5169 | **Станок сверлильный 2М-118 (2Н 155), 1990 г. в.** | 394,80 | 19,74 |
| 16 | 70 | **Станок-автомат сеткоплетельный ВСА 97/15-50, 1998 г. в.** | 714,00 | 35,70 |
| 17 | 50 | **Станок заточной 3А64Д, 1972 г. в.** | 2 142,00 | 107,10 |
| 18 | 4032 | **Станок точильно-шлифовальный ТШ-3, 2006 г. в.** | 197,40 | 9,87 |
| 19 | 221 | **Станок универсально-заточной 3М-642, 1986 г. в.** | 2 226,00 | 111,30 |
| 20 | 4380 | **Обогреватель переносной Master BV 170 E** | 690,00 | 34,50 |

**Изолированные помещения** в составе:

| № лота | Инв. номер | Наименование (назначение) | Общая площадь | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| 21 | 500/D-708145927 | **Административное помещение** | 402,5 кв. м | г. Минск, ул. Бабушкина, 48-5 |
| | Начальная цена с НДС 20% – **104 357,40 бел. руб.** (снижена на 65%) Шаг аукциона – **5 217,87 бел. руб.** | | | |
| 22 | 500/D-708145924 | **Административное помещение** | 289,3 кв. м | г. Минск, ул. Бабушкина, 48-2 |
| | Начальная цена с НДС 20% – **66 411,87 бел. руб.** (снижена на 65%) Шаг аукциона – **3 320,59 бел. руб.** | | | |
| 23 | 500/D-708145928 | **Административное помещение** | 402,8 кв. м | г. Минск, ул. Бабушкина, 48-6 |
| | Начальная цена с НДС 20% – **90 656,30 бел. руб.** (снижена на 65%) Шаг аукциона – **4 532,82 бел. руб.** | | | |
| 24 | 500/D-708145929 | **Административное помещение** | 408,9 кв. м | г. Минск, ул. Бабушкина, 48-7 |
| | Начальная цена с НДС 20% – **91 994,95 бел. руб.** (снижена на 65%) Шаг аукциона – **4 599,75 бел. руб.** | | | |

**Ремонтно-механическая мастерская, оборудование и иное имущество, реализуемое одним лотом:**

| № лота | Инв. номер | Наименование (назначение) | Общая площадь | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| 25 | 500/D-708182365 | **Ремонтно-механическая мастерская** (Помещение неустановленного назначения) | 3401,4 кв. м | г. Минск, ул. Бабушкина, 48/1-2 |

**С перечнем оборудования и иного имущества, входящего в состав лота,** можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by

**Начальная цена с НДС 20% – 996 081,26 бел. руб.** (снижена на 40%) **Шаг аукциона – 49 804,06 бел. руб.**

| | |
|---|---|
| Обременения по лотам №№21–25 | Арендаторы. Подробная информация на сайте организатора аукциона. |

**С подробной информацией по предметам аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона** WWW.CPO.BY

| | |
|---|---|
| Порядок ознакомления | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется во вторник, среду и четверг с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Расолько Александр Александрович, главный энергетик, контактный телефон МТС 80295702184 |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с 3012343260010; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты: по лотам №№1–20** не более **10 (десяти) дней** со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

**По лотам №№21–25** не более **30 (тридцати) дней** со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. №16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **WWW.CPO.BY**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5%

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи, в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звезда» 13.05.2017 г.

| | |
|---|---|
| Дата, место и время проведения аукциона | **14.06.2017** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Бабушкина, 48, актовый зал, ОАО «Реммех»** |
| Дата, место и время окончания приема документов | **12.06.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| Контактные телефоны | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ
### О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении торгов в виде открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Агросервис»**

Лот №1. **Капитальное строение с инв. №700/С-80719 – Профилакторий для ремонта автомобилей**, площадью 1038,2 кв. м, расположено по адресу: г. Могилев, ш. Славгородское, 44а/1, фундамент – ж/бетонные блоки, стены и перегородки – кирпичные, перекрытие – ж/бетонное, крыша – совмещенная рулонная. Составные части: эстакада бетонная (площадь 85 кв. м), ограждение кирпичное (площадь 319 кв. м), мощение асфальто-бетонное (площадь 998 кв.м). Сведения о земельном участке: земельный участок с кадастровым номером 740100000007004991 (право постоянного пользования), площадью – 0,4222 га, назначение: земельный участок для содержания и обслуживания зданий и сооружений для обслуживания автотранспорта, расположен по адресу: г. Могилев, ш. Славгородское, 44а/1.

***Начальная цена продажи – 110 310,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка – 11 031 бел. руб.***

Лот №2. **Капитальное строение с инв. №700/С-80721 – Профилакторий для ремонта автомобилей**, площадью – 377,8 кв. м, расположено по адресу: г. Могилев, ш. Славгородское, 44а/2, фундамент – ж/бетонные блоки, стены и перегородки – кирпичные, перекрытие – ж/бетонное, крыша – совмещенная рулонная. Сведения о земельном участке: земельный участок с кадастровым номером 740100000007005007 (право постоянного пользования), площадью – 0,0428 га, назначение: земельный участок для содержания и обслуживания зданий и сооружений для обслуживания автотранспорта, расположен по адресу: г. Могилев, ш. Славгородское, 44а/2.

***Начальная цена продажи – 43 090,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка – 4 309 бел. руб.***

| | |
|---|---|
| Продавец | ОАО «Агросервис», УНП 700010487, г. Могилев, ш. Славгородское, 44а |
| Расчетный счет для перечисления задатка | Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, МФО 153001369 (при перечислении задатка до 30.06.17) номер счета в формате IBAN BY21BPSB30121543370109330000, BIC банка BPSBBY2X (при перечислении задатка с 04.07.17) |
| Дата, время и место проведения аукциона | **Аукцион проводится 6 июля 2017 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 5 июля 2017 года до 15.00 |
